Я. Н. МАРОЗАВА

М А Р Ф Е М І К А

Тэарэтычныя асновы, заданні, узоры разбору, тэсты

Вучэбна-метадычны комплекс па сучаснай беларускай мове

Рэпазіторый ВГУ

УДК 808. 26-5 (075.8)
ББК 81.411.3 - 2- 923

Аўтар: дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М.Машэрава
Я.Н. Марозава
Рэцэнзенты: прафесар кафедры агульнага і рускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава доктар філалагічных навук **В.А. Маслава,**
дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М.Машэрава кандыдат філалагічных навук Г.А.Арцямёнак

Вучэбна-метадычны комплекс прызначаны для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей. У дапаможніку змешчаны тэарэтычныя звесткі па найбольш важных, ключавых пытаннях марфемікі, аналізуюцца тыповыя памылкі студэнтаў у марфемным аналізе слоў, падаюцца неабходныя парады, лінгваметадычныя каментарыі па складаных ці спрэчных пытаннях марфемікі, прапануюцца парадак і ўзоры марфемнага разбору, трэніровачныя і кантрольныя тэсты і прыкладная кантрольная работа па марфеміцы.

Дапаможнік можа быць выкарыстаны таксама настаўнікамі і школьнікамі пры падрыхтоўцы да алімпіяд і да экзаменаў, а таксама ўсімі, хто цікавіцца марфемнай структурай слоў.

УДК 808. 26 – 5 (075.8)
ББК 81.411.3 – 2 - 923

© Марозава Я.Н., 2004
© Выд-ва УА ”ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2004

Репозиторий ВГУ

I МАРФЕМНАЯ СТРУКТУРА СЛОЎ

(тэарэтычныя пытанні)

****

① УВОДЗІНЫ

Зри в корень.
Казьма Пруткоў

Апошнім часам нярэдка можна пачуць ”модныя” нараканні і нават дыскусіі наконт мэты і неабходнасці вывучэння марфемнай структуры слоў, словаўтварэння і граматыкі. Пачуць ад студэнтаў, некаторых настаўнікаў і нават навукоўцаў, якія абсалютуюць сваё захапленне маўленнем без уліку усякіх нормаў таго ж маўлення, ігнаруючы яго элементарную пісьме́ннасць. Маўляў, навошта вывучаць структуру слоў і структуру мовы ў цэлым? Гэта лішняе ў наш час. Галоўная ж мэта вывучэння мовы — авалоданне звязнай мовай і маўленчымі навыкамі дзеля камунікацыі.

Думаецца, дастаткова пераканаўча адказалі на такія нараканні, развагі ды пярэчанні галоўны рэдактар часопіса ”Роднае слова” Міхась Шавыркін і яго намеснік Іван Ждановіч. [1] Прачытайма артыкулы гэтых шчырых рупліўцаў беларускай мовы. Магчыма, разважанні іх і стануць штуршком, з якога пачнецца спазнанне сябе, сваёй існасці ў Сусвеце, сваёй ролі ў ім, ролі на ўроку Мовы ў школе. І з’явіцца ўсведамленне значэння і мэты тонкага разумення структуры слоў, законаў іх словаўтварэння, структуры мовы ў цэлым. Прывядзём толькі ўрыўкі з названага артыкула І.Ждановіча: «…мова, слова складаецца […] з формы-абалонкі (гук, знак…), у якой, як зярнятка ў шкарлупіне арэшка, гнездзіцца магутны квант чалавечае думкі […]. Пры такім падыходзе становіцца зразумелым сэнс парадаксальнага выказвання *мысль изречённая есть ложь*, бо выказаная думка ўжо абцяжарана, ”скрыўлена” тою формаю, у якую ўкладзена,— словамі. *{Падкрэслена мной. — М.Я.}* Пошукі слова, якімі так часта пакутуюць літаратары, ёсць жаданне зрабіць як мага больш дакладную ”форму”-абалонку для свайго тонкага адчування, душэўнага парыву […]. Гэтае бачанне — мастаком, пісьменнікам, кампазітарам — навакольнага свету бывае настолькі вытанчаным, што патрабуе і адпаведнага атанчэння пачуццяў тых людзей, якія спрабуюць іх зразумець. Таму, дарэчы, многія не разумеюць паэзію, класічную музыку, жывапіс — гэта паказчык іх нявыхаванасці, нявытанчанасці душы, сведчанне грубага ўспрымання свету. Тонкае ўспрымаецца тонкім […]. Вось так, на памежжы свету

[1] *Шавыркін М.* Мова — душа народа // Роднае слова, № 11, 1993; *Ждановіч І.* Гэта шлях…: Спроба тонкага разумення сутнасці мовы // Роднае слова, № 10, 1993.

Репозиторий ВГУ

бачнага і нябачнага, тонкаю ніцінкаю працягнена слова: само тонкае ці грубае, шчырае ці хлуслівае, роднае ці чужое. Слова, якое можа падняць з каленяў — і слова, перад якім сам гатовы ўкленчыць… […]

Страта людзьмі мовы (а мне, вядома ж, душа баліць найперш за беларускую) ёсць страта, неспазнанасць духоўнае спадчыны, глыбіннай народнай мудрасці, без якой на ветравеі спакуслівага веку цяжка ацалець як душы, так і целу чалавечаму. Таму сёння мне падаецца найбольш важнай не столькі камунікатыўная функцыя беларускай мовы, колькі мова як універсальны сродак для далучэння да жыццядайнай крыніцы нацыянальнай культуры. *{Падкрэслена мной. — М.Я.}* »[1]

Вывучаючы мову як сродак камунікацыі, пры марфемным разборы і словаўтваральным аналізе слоў неабходна максімальную ўвагу ўдзяляць іх значэнню, сэнсавым сувязям з іншымі словамі, адрозненню паміж аднакаранёвымі словамі, якое ўносіцца афіксамі, г. зн. адценнямі ў значэннях прыставак, суфіксаў, постфіксаў. Менавіта гэта падкрэсліваў доктар філалагічных навук А.І.Маісееў, які трапна заўважыў, што **марфемны склад слоў можа быць выкарыстаны як адна з асноў "здагадкі" пра значэнне слоў**, ён слу́жыць базай правапісу слоў (у адпаведнасці з марфалагічным прынцыпам правапісу пішуцца, напрыклад, суфіксы ў словах *дэарыізацыя*, а не *дэарыезацыя*, *асіннік*, а не *асіннек*). Марфемны склад — гэта "застылая ў марфемах словаўтваральная гісторыя (дакладней — генеалогія) слова і яго генетычных папярэднікаў, напрыклад, *а-суш-энн-е* — гэта своеасаблівая кампрэсія шэрагу розначасовых словаўтваральных актаў: *сух(і) → суш-ы-ць → а-сушыць → асуш-энн-е*"[2]

Веданне будовы слоў ма́е вялікае прыкладно́е значэнне, у прыватнасці, пры машыннай апрацоўцы тэксту, пры авалоданні замежнымі мовамі. Ды і для свядомага, асэнсаванага авалодання сваёй роднай ці блізкароднаснымі мовамі недастаткова ведаць толькі лексіку, слоўнікавы склад мовы. На думку доктара філалагічных навук праф. А.М. Ціханава, вывучэнне і добрае веданне складу слова, правілаў словаўтварэння неабходна для трывалага засваення правапісу слоў: "Добрае веданне правілаў словаўтварэння, уменне чляніць слова на састаўныя кампаненты, вызначаць ролю і значэнне частак слова дапамагае пазбегнуць многіх памылак ва ўжыванні слова, садзейнічае павышэнню пісьме́ннасці і культуры мовы."[3]

Такім чынам, для правільнага разумення сэнсу слоў і дакладнага ўжывання іх неабходна разбірацца ў структуры слоў. А адчуванне слова,

---

[1] *Ждановіч І.* Указаная вышэй праца.

[2] *Моисеев А. И.* Основные вопросы словообразования в современном русском литературном языке.— Л-д, 1987, с. 88 – 89.

[3] *Тихонов А.Н.* Школьный словообразовательный словарь русского языка.— М., 1978, с. III – IV.

Рэпозиторый ВГУ

як слушна сцвярджаў А.М.Ціханаў, можна развіваць у сабе толькі ўважлівымі адносінамі да састаўных элементаў слова, якія часта выступаюць носьбітамі самых тонкіх адценняў значэння, што адрозніваюць адно слова ад другога. Параўнаем: ***пера**плаціць*, ***вы**плаціць*, ***а**плаціць*; ***у**пісаць*, ***вы**пісаць*, ***над**пісаць*, ***пера**пісаць*, ***пры**пісаць* і г. д.; ***на**дзець акуляры (*а не ***а**дзець)*, ***на**рэзаць каўбасы*, *сыру*, *хлеба* (а не ***па**рэзаць*) і да т. п.

② ПАНЯЦЦЕ МАРФЕМІКІ І МАРФЕМЫ

Тэрмін **м а р ф е м і к а** выкарыстоўваецца ў лінгвістычнай літаратуры ў двух значэннях: 1) сукупнасць марфем у мове; 2) раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца зна́чымыя часткі слова — марфемы. (Параўн. з тэрмінамі **лексіка, фразеалогія, фанетыка, фаналогія, графіка** і інш., якія таксама ўжываюцца ў двух значэннях). З гэтымі ж значэннямі ўжываецца ў навуковых працах і тэрмін марфемная структура слоў.

Тэрмін і паняцце **марфема** ўпершыню ў 70-х г.г. XIX ст. быў уведзены І.А. Бадуэнам дэ Куртэнэ як **родавае абагульненне** ўжо вядомых відавых паняццяў — марфалагічных частак слова: каранёў, прыставак, суфіксаў, канчаткаў і інш. — і з'яўляецца агульнапрынятым у сучаснай лінгвістыцы. [1]

М а р ф е м а — гэта найкарацейшая зна́чымая частка слова. Інакш кажучы, гэта мінімальная структурная частка слова, якая выражае пэўнае **значэнне** (лексічнае, граматычнае, тое і другое разам). Напрыклад, у слове *сам а вы знач ы л і ся* | **8** марфем: 2 карані, прыстаўка *-вы-*, суфіксы *-ы-* і *-л-* , канчатак *-і-* , постфікс *-ся* і інтэрфікс *-а-* . Далейшае дзяленне марфем на значымыя часткі немагчыма. Марфему можна падзяліць толькі на гукі (фанемы), але асобна ўзятыя **гукі значэння ў слове не маюць**, як і **склады**, якія таксама ніякіх значэнняў не выражаюць. **Большасць марфем** маюць пэўнае **лексічнае значэнне.** Напрыклад, суфікс **назоўнікаў** *-іст- (-ыст-)* абазначае дзеючую асобу: *ідэал**іст**, атэ**іст**, трактар**ыст**, парашут**ыст***. **Прыметнікавы** ж суфікс *-іст-* мае іншае значэнне: **'**які характарызуецца наяўнасцю, мае ўласцівасці таго, што ў базе**'** : *галас**іст**ы, цян**іст**ы, глін**іст**ы, камян**іст**ы.*

Суфіксы *-аў- (-ав-), -оў- (-ов-), -еў- (-ев-), -ёў- (-ёв-)* маюць **у адносных** прыметнікаў значэнне **'**адносіны да таго, што ў базе**'** *(дам**ав**ы, стал**ов**ы, двар**ов**ы, вішн**ёв**ы)*, а **ў прыналежных** прыметнікаў **—** значэнне

[1] *Бодуэн де Куртенэ И.А.* Введение в языкознание (1917) // Избранные труды по общему языкознанию: В 2-х т. Т. 2. — М., 1963, с. 290 – 291.

Репозиторий ВГУ

’прыналежнасць таму, хто ў базе**’** (*дзед**аў**, сын**ав**а, бабр**ов**а, мядзведз**еў**, Міхас**ёў***).

Адно са значэнняў **дзеяслоўнай** прыстаўкі *пера-* **—** **’** зноў, паўторна выканаць базавае дзеянне **’** : ***пера**працаваць*, ***пера**групаваць*, ***пера**маляваць*, ***пера**пісаць.* У **назоўнікаў**, утвораных ад гэтых і іншых дзеясловаў, суфікс *-к-* мае значэнне **’**апрадмечанасць дзеяння**’** : *перапрацоў**ка**, перагрупоў**ка**, перамалёў**ка**, перапіс**ка**, перагартоў**ка***. Суфікс *-ну-* ў наступных дзеясловаў мае значэнне **’** аднакратна, аднаразова выканаць дзеянне **’** : *крык**ну**ць*, *мах**ну**ць*, *стук**ну**ць*, *браз**ну**ць*; суфікс *-ану-* **—** значэнне **’** аднакратна і рэзка, ігненна, інтэнсіўна выканаць дзеянне**’** : *сек**ану**ць*, *грыз**яну**ць*, *сіг**ану**ць*; суфікс *-е-* **—** значэнне **’**станаўлення прыметы**’** : *сів**е**ць*, *цямн**е**ць*, *чарн**е**ць*, *ясн**е**ць.*

Канешне, **значымасць** марфем праяўляецца не заўсёды выразна, часам значэнне марфем даволі цьмянае, яны маюць вельмі абстрактнае значэнне, фармулёўка якога даецца студэнтам з цяжкасцю. Напрыклад, у прыведзеных дзеясловах і назоўніках дзеяслоўны суфікс *-оў- (-ав-)*, а таксама *-ва-, -оўва-* характарызуюцца шырокім адцягненым значэннем. Гэткае ж невыразнае значэнне, высокая ступень яго абагуленасці і ў тэматычных галосных **—** дзеяслоўных суфіксаў *-а-, -о-, -і-, -ы-, -е-* : *чыт**а**ць, ляж**а**ць, кал**о**ць, раб**і**ць, гавар**ы**ць, вісе**е**ць, шып**е**ць* і пад. У такіх выпадках даведкі пра семантыку марфем можна знайсці ў ”Беларускай граматыцы”, дзе даецца класіфікацыя ўтварэння слоў розных часцін мовы з указаннем значэнняў афіксаў.

Зусім неакрэсленае значэнне злучальных марфем у складаных і ў простых словах: *крыг**а**ход, пол**е**ахоўны, амерык**ан**скі, ветк**аў**скі, неапал**іт**ан**с**кі* і г. д. Былі прапановы падобныя злучальныя марфемы называць асемантычнымі, г. зн. часткамі слова без значэння, нязна́чымымі, пустымі марфемамі (Ю.С.Маслаў, А.А.Земская).[1] Але ж, як слушна сцвярджае А.І. Маісееў, ”дапушчэннем асемантычных марфем разбураецца агульнае вызначэнне марфемы як значымай часткі слова. Таму больш прымальны іншы шлях пераадолення адзначаных цяжкасцей **— шырокае разуменне значэння марфемы:** значэнне марфем не абавязкова сэнсавае, але таксама і структурнае , у цэлым **—** структурна-семантычная функцыя ў складзе слова.” [2] [*Падкрэслена мной. — М.Я.*] Структурна-семантычная функцыя, напрыклад, дзеяслоўных суфіксаў *-а-, -я-, -і-, -ы-, -ав- (піс**а**ць, гул**я**ць, ваз**і**ць, прапан**ав**аць)* у тым, што яны **адносяць дзеясловы да**

---

[1] *Маслов Ю.С.* О некоторых расхождениях в понимании термина ”морфема” // Учён. зап. Ленингр. ун-та, № 301. Вып. 60. Сер. филол. наук.**—** Л-д, 1961, с. 142; *Земская Е.А.* Интерфиксация в современном русском словообразовании // Развитие грамматики и лексики современного русского языка. **—** М., 1964.

[2] *Моисеев А.И.* Основные вопросы… , с. 38.

Репозиторий ВГУ

пэўнага структурнага і словазменнага класа, указваюць на часціну мовы, і ў гэтым іх словаўтваральнае значэнне.

У складаных словах злучальныя марфемы (інтэрфіксы) выконваюць злучальную функцыю, падобную да функцыі злучальных злучнікаў: *лес* □ і *ваз іць → лес-а-воз∅*.

Дзякуючы разуменню носьбітамі мовы лексічных і граматычных значэнняў марфем можна пры дапамозе марфем сканструяваць **аказіянальнае слова**, г. зн. выпадковае, якое не адпавядае агульнапрынятаму ўжыванню, абумоўленае спецыфічным кантэкстам, але **зразумелае ўсім**. Напрыклад: *Душ падданых з'ярміў□ ён мільён (Я.Купала).* (У значэнні 'запрыгоніў'.) *Супыніся ты, хмара, над борам — апусці свой на лес дажджапад∅□ (М.Шаховіч). Ты рамонкаў белавейкі не зрывай (Р.Барадулін).* (У значэнні 'пялёсткі'). *Гэта я з табой вечарую… (В.Зуёнак).*

У сучаснай прэсе, у творах пісьменнікаў і паэтаў даволі часта сустракаюцца прыклады аўтарскіх наватвораў-аказіяналізмаў, якія адлюстроўваюць змены ў грамадскім жыцці і палітычным ладзе краіны. Некаторыя з такіх патэнцыяльных аказіяналізмаў як толькі паявіліся на старонках друку, дык адразу сталі частотнымі, рэгулярна выкарыстоўваліся ў розных крыніцах і хутка "прыжыліся", сталі агульнаўжывальнымі. Вось некаторыя з іх:

Вядома, што слэнгавы тэрмін савок на тэрыторыі былога Саюза і далёка за ягонымі межамі функцыянуе як сіноніім інтэлектуальнай абмежаванасці, нават хамства. Савецкай улады ўжо няма, а тая, што існуе,— выразна саўковая. Будзьма мець надзею, што шалупінне саўковасці зляціць з беларускіх душ… (ЛіМ, 26.05.1995).

Як бачна, тут па агульнапрынятай у літаратурнай мове словаўтваральнай мадэлі ствараецца цэлы ланцужок аднакаранёвых слоў: *савок → саўк**ов**ы → саўков**асць**.* Яшчэ прыклады:

*У часы **пасля**СССР**аўск**ай эйфарыі…; … на СНД**эшн**ыя сходкі (ЛіМ, 26.01.1996)*; *… сам∅саб**е**рэжысёр**ск**і торцік (З тэлеперадачы "Сам сабе рэжысёр")*; *… каш**а**малашн**а**я тэлекантро**ш**а (З тэлеперадачы "Кашамалаша"). Мы сегодня не в Евразии, мы сегодня в Азиопе (З тэлевыступлення на НТВ экс-міністра замежных спраў РФ Андрэя Козырава 4.04.1999). У Польшчы і Славаччыне… кіраўнічыя партыі патрабуюць "зваротнай платы" ад сваіх бізнес**оўц**аў (Свабода, № 4, 1995). І міністры, і невялікія чыноўнікі патрэбныя не з племені падтак**ач**оў (Свабода, № 3– 4, 1990). Былі наладжаны грунтоўныя, усебаковыя перамов**ін**ы (Тамсама). Таму і сённяшні наш лад вызначаецца адпаведным чынам. Бульбаш**ызм**. Экзатычна, але сваё (ЛіМ, 8.08.1995). …Клопату пра "рус**к**ад**ум**н**ае**" насельніцтва (Свабода, № 9, 1994).*

З наватвораў можна стварыць нават мастацкі твор, сэнс якога цудоўна зразумеюць не толькі дарослыя, але і дзеці. У прыватнасці, прывядзём адзін з прыкладаў, які быў змешчаны на гумарыстычна-сатырычнай

Репозиторий ВГУ

апошняй старонцы ”Литературной газеты”. Гэта казка Л.Петрушэўскай ”Пуськи бятые”, тэкст якой без цяжкасці зразумее кожны славянін:

Сяпала Калуша по напушке и увазила бутявку. И волит:

— Калушата, калушаточки! Бутявка!

Калушата присяпали и бутявку стрямкали. И подудонились. А Калуша волит:

— Оее, оее! Бутявка-то некузявая!

Калушата бутявку вычучили. Бутявка вздребезнулась, сопритюкнулась и усяпала с напушки. А Калуша волит:

— Бутявок не трямкают. Бутявки дюбые и зюмо-зюмо некузявые. От бутявок дудонятся.

А бутявка волит за напушкой:

— Калушата подудонились! Калушата подудонились! Зюмо некузявые! Пуськи бятые! [1]

Менавіта таму, што **марфемы** маюць некаторую лексічную паўназначнасць, яны могуць ужывацца **ў якасці самастойных слоў.** Успомнім прыклады са шматлікіх фармулёвак правіл тыпу: ”*У слове* ***абагнаць*** ***аба-*** *— прыстаўка*”. У гэтым сказе ***аба-*** ўжо з’яўляецца не прыстаўкай, а коранем, бо ўжываецца ў ролі самастойнага слова — нязменнага назоўніка, выконвае сінтаксічную функцыю дзейніка.

Яшчэ падобныя прыклады:

Але, відаць, адбылося тут і некаторае ***пера*** *(Комс. правда, 21.09. 68).* (Маецца на ўвазе ’перабольшанне’). *Сёння толькі ваяўніча настроеныя аптымісты возьмуцца сцвярджаць, што нашаму ”зайцу” (’ беларускаму рублю’) пагражае стабілізацыя , хоць бы частковая канвертацыя і да таго падобная* ***”…ацыя”*** *(Звязда, 15.10.1993).*

У такіх выпадках службовыя марфемы — прыстаўкі, суфіксы — перастаюць імі быць, ператвараюцца ў карані, субстантывуюцца, г. зн. ужываюцца як назоўнікі.

③ ТЫПЫ МАРФЕМ

Марфемы адрозніваюцца па шэрагу прыкмет:

❶ ПА РОЛІ Ў СЛОВЕ марфемы падзяляюцца на **абавязковыя і неабавязковыя.** **Абавязковыя марфемы** (або каранёвыя) — гэта карані, без іх не можа быць слова. **Неабавязковыя**

[1] Цытуецца па кн.: *Михневич А.Е.* Язык, которого нет… — Мн., 1988, с. 56.

Репозиторий ВГУ

марфемы (або службовыя, афіксальныя) **—** гэта афіксы, якія могуць быць у слове, а могуць і не быць.

Афікс — гэта любая значымая частка слова, за выключэннем кораня. Гэта прыстаўкі (прэфіксы), суфіксы, канчаткі, постфіксы, інтэрфіксы. Напрыклад, у слове *сам а а куп і ў □ ся* **6 афіксаў:** інтэрфікс ***-а-***, прыстаўка ***а-***, суфіксы ***-і-*** і ***-ў-***, канчатак нулявы □ і постфікс ***-ся***.

❷ **ПА ФУНКЦЫІ** **афіксальныя** марфемы падзяляюцца на

1) Словазменныя — гэта **канчаткі** ўсіх зменных часцін мовы: *няс-**ём**, бяр-**э**□**м**, чытай-**ма**, зрабіў□**ся**, ч-**аго**-**сь**, к-**ім**-**сьці**, пяць□**дзесят**□* і г. д. Словазменным з'яўляецца і **постфікс *-це*** ў форме загад. ладу 2-й асобы мн. л.: *едзь□ **це**, тр ы **це.*** Часам яго называюць формаўтваральным постфіксам. [1]

2) Словаўтваральныя — гэта афіксы, якія ўтвараюць новае слова з новым лексічным значэннем, напрыклад: *гуслі → гусл**яр**, высокі → **па**высі ць → павыш**энне**, дзе**сь**, хто**сьці**, што-**небудзь**, **абы**-як, несці**ся**, **вы**мыц**ца**, чак**а**ць (чак**ай**э), дай **і** ц**ца**, г**нецца**, мал**ява**ць (мал**юй**э), жы**ві**ць (жы**ўлю**), сум**ава**ць (сум**уй**э), кіна**фікава**ць* і г. д.

Найбольшая колькасць марфем у мове **—** словаўтваральныя.

3) Формаўтваральныя — гэта афіксы, якія служаць для ўтварэння новай формы таго самага слова пры захаванні ім лексічнага значэння. Да іх адносяцца:

- суфіксы інфінітыва (пачатковай формы дзеясл.): *бег**чы**, ес**ці**, да**ць***;
- суфіксы пр. ч. дзеясловаў: *е**ў**, рос∅□, пёк∅□ся, пі**ло**, шчыравалі*;
- зваротны постфікс *-ся* ў дзеясловах залежнага стану (у пасіўных канструкцыях): *Посуд мые**цца** мной, а газеты чытаю**цца** Інай.*
- прыстаўкі і суфіксы, што ўтвараюць форму законч. трывання, не мяняючы лексічнага значэння (у суадносных трывальных парах дзеясловаў): *пісаць → **на**пісаць, чытаць → **пра**чытаць, ехаць → **пры**ехаць; размаляваць → размалёў**ва**ць, дапісаць → дапіс**ва**ць*;
- суф. дзеепрыметнікаў (асобай формы дзеяслова) *-уч-(-юч-), -ач-(-яч-); -ўш-, -ш-, -л-; -ем-, -ім-; -ен-, -ан-, -н-, -т-*: *рэгулюй**уча**я, гавор**ача**я, пасівел**ы**, зрабіў**ша**я, прынёс**шы**я, аналізу**ем**ы, прыводз**ім**ы, прынес**ен**ы, дагледж**ан**ы, напіса**н**ы, змола**т**ы*;
- суфіксы дзеепрыслоўяў (нязменнай формы дзеяслова) *-учы (-ючы), -ачы (-ячы); -ўшы, -шы*: *нес**учы**□, нос**ячы**, згада**ўшы**, спёк**шы***;

[1] Гл.: Тихонов А.Н. Словообразовательный словарь …, т. 1, с. 22.

Репозиторий ВГУ

- прыстаўка *най-* і суфіксы *-ейш- (-эйш-), -ей (-эй), -ай* ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў: ***най***цяпл***ейш***ы, дабр***эйш***ы, ***най***лепш, цішэ***й***, смял***ей***, гора***й*****;**
- суфіксы, што ўтвараюць памяншальна-ласкальныя і павелічальна-ўзмацняльныя формы: мам***уля***, тат***ка***, дзяд***уля***, сын***ок***, нас***ішча***, дабр***энны***, сів***енькі***, добр***анькі***, ціх***еньк***а, ціх***утк***а і г. д.;
- суфіксы *-яц-, -ят-* ва ўскосных склонах у назвах маладых істот і ў рознаскланяльных назоўнікаў на *-мя*: кацян***яці***, кацян***ят***ам, ім***ені***, плем***ені***, стрэм***ені***.

Некаторыя даследчыкі ў межах гэтай 2-й класіфікацыі (паводле функцыі) выдзяляюць яшчэ і

4) сінкрэтычныя марфемы, г. зн. **словаформаўтваральныя.** [1] Сюды адносяць канчаткі такіх слоў, як *кум**а**,* у рускай мове *раб**а**, супруг**а**,* якія выражаюць граматычнае значэнне **формы** склону, ліку, роду і **лексічнае значэнне асобы жаночага полу.** У гэтую ж падгрупу ўключаюць і дзеясловы са словаўтваральнымі афіксамі накшталт ***пера****пісаць*, ***у****пісаць*, ***вы****пісаць* і г. д., дзе прыстаўкі мяняюць **і лексічнае значэнне** базавага дзеяслова, **і форму** трывання. Да сінкрэтычных часам адносяць нават субстантываваныя прыметнікі, дзеепрыметнікі тыпу *сталов**ая**, настаўніцк**ая*** (са значэннем ’памяшканне’); *дзяжурн**ы**, каманду**ючы*** (’назва асобы’); *камандзіровачн**ыя**, кватэрн**ыя**, сутачн**ыя*** (’грошы, выплаты’), дзе былыя канчаткі прыметнікаў, дзеепрыметнікаў ”функцыянальна пераўтвараюцца”, перастаюць быць ”знакамі якасці ”. [2]

Мы будзем прытрымлівацца больш абгрунтаванага і лагічнага пункта погляду, які сустракаем, у прыватнасці, у Немчанкі В.М., а таксама ў ”Словаўтваральным слоўніку беларускай мовы”, паводле якога словы тыпу *кум∅а, выбар∅ы, праг∅а, залік∅, праезджы, залат∅ы, пят∅ы, шост∅ы* і г. д. утварыліся не канчаткамі, а нулявымі словаўтваральнымі суфіксамі, наяўнасць якіх тут тлумачыцца ”тым, што ў іншых вытворных словах ідэнтычныя словаўтваральныя значэнні выражаюцца звычайнымі словаўтваральнымі суфіксамі, параўн.: *выбар∅ы* і *галасава**нне**, кум∅а* і *свякр**оў**, залат∅ы* і *сярэбр**аны**.*” [3] Т. ч., сінкрэтычныя прыстаўкі і

---

[1] Гл.: *Розенталь Д.Э., Теленкова М.А.* Словарь-справочник лингвистических терминов.— М., 1976, с. 33; *Тихонов А.Н.* Словообразовательный словарь русского языка: В 2-х т. Т. 1. — М., 1985, с. 20; *Шакун Л.М.* Словаўтварэнне / Вучэбны дапаможнік для філфакаў ВНУ.— Мн., 1978.

[2] *Тихонов А.Н.* Тамсама.

[3] *Немченко В.Н.* Современный русский язык. Словообразование. — М., 1984, с. 35.

Репозиторий ВГУ

суфіксы мы будзем адносіць да словаўтваральных, а канчаткі лічыць толькі словазменнай марфемай.

❸ **ПА МЕСЦЫ АДНОСНА КОРАНЯ** афіксы падзяляюцца на марфемы, якія знаходзяцца

1) <u>перад</u> <u>коранем</u> — гэта **прыстаўкі:** ***пана****выдзіраць, эмігрант*;

2) <u>пасля</u> <u>кораня</u>: а) суфіксы: *смех, жы**цц**ё, г**нуц**ца, свацц∅я, воўч∅ы, гул**яj**э, ціш**эj**уць*; **б) канчаткі:** *т **ой** , мой□, пі□ це, сем□сот□, чый□-небудзь, чыj **ім** сьці*; **в) постфіксы:** *куды**сьці,** што**сь,** які-**небудзь,** мый□ **це,** б'е**цца,** сысці**ся,** імкнуц**ца;***

3) <u>паміж</u> <u>марфемамі</u> — інтэрфіксы: а) паміж каранямі (у складаных словах): *гал**а**лёд∅, пяц**і**дзесяц**і**годдз∅е, дв**ух**бор'е, тр**ох**дзённы*; **б) паміж коранем і суфіксам** (у простых словах): *стаўбц**оў**скі, ялц**ін**скі, афрык**ан**скі, кіно**ш**ны, купэ**й**ны.*

❹ **ПА ЧАСТОТНАСЦІ ЎЖЫВАННЯ** афіксы дзеляцца на

1) <u>рэгулярныя</u>, якія сустракаюцца ў вялікай колькасці слоў, характарызуюцца паўтаральнасцю, утвараючы пры гэтым цэлыя словаўтваральныя або формаўтваральныя рады: *лясы, пал**і**; касц**ямі**, трав**амі**; бел**ават**ы, сін**яват**ы, мал**енькі**, нас**ішч**а; мал**яваць**, гарт**аваць**; дзед**ава**, каз**ін**ы, снеж**н**ы, галас**іст**ы, ганар**лів**ы; **на**рыхтава**ць**, **па**еха**ўшы**, **пад-, над-, без-, не-, вы-, у-, за-, пера-, пра-*** і падобныя марфемы;

2) <u>нерэгулярныя</u>, якія сустракаюцца ў невялікай колькасці слоў, радоў не ўтвараюць: *дзіц**ятк**а, люб**оў**, пашт**амт,** дубл**ікат,** дзвяр**ыма**, касць**мі**, конь**мі**, ем, дам, ясі, дасі, ес**ць**, дас**ць**, ям**о**, дам**о**, яс**це**, дас**це.***

❺ **ПА ЗДОЛЬНАСЦІ ЎТВАРАЦЬ НОВЫЯ СЛОВЫ Ў СУЧАСНАЙ МОВЕ** афіксы падзяляюцца на

1) <u>прадуктыўныя</u> (гл. вышэй прыклады рэгулярных афіксаў) і

2) <u>непрадуктыўныя</u> , напр., некаторыя былыя рэгулярныя марфемы сёння новых слоў не ўтвараюць: *зван**ар**, пек**ар**, піс**ар**; бараць**ба**, хадзь**ба**, кась**ба**, прось**ба**, грозь**ба**; нось**біт**, сей**біт**, бараць**біт**, найм**іт**; **пра**шчур, **пра**дзед, **пра**бабка, **пра**ўнук, **пра**радзіма, **пра**мова* і інш. Нерэгулярныя афіксы заўсёды непрадуктыўныя, а рэгулярныя могуць быць і прадуктыўнымі, і непрадуктыўнымі.

❻ **ПА СЕМАНТЫЧНЫХ АДНОСІНАХ МІЖ САБОЙ** марфемы, як і словы, бываюць сінанімічнымі, мнагазначнымі, аманімічнымі, антанімічнымі.

Репозиторий ВГУ

1. Сінанімічныя марфемы. Як і словы-сінонімы, яны маюць аднолькавае або блізкае значэнне, а гучаць па-рознаму. Напрыклад:

Значэнне **'дзейнай асобы'** ў суфіксах: *буравік, вартаўнік, разразальшчык, грузчык, зборшчык, тварэц, выхавацель (выхавальнік), трактарыст, машыніст, прамоўца* і інш.

Значэнне **'найвышэйшай ступені прыметы'** ў прыстаўках: *найважнейшы, звышхуткі, архіважны, супермодны, ультракароткі, гіпергукавы, экстралінгвістычны.*

2. Мнагазначныя марфемы. Як і ў мнагазначных слоў, полісемія ў марфем развіваецца на базе пэўнага агульнага значэння марфемы, якое дэталізуецца ў словах хоць і рознай, але блізкай семантыкі.

Напрыклад, **суфікс -ік** у словах **з агульным значэннем канкрэтнага прадмета** выступае як полісемічны, пры дапамозе яго ўтвараюцца

1) назвы асоб: *перадавік, разумнік, рамонтнік, прызыўнік, буравік, адстаўнік, сезоннік, сучаснік* і інш.;

2) назвы прылад дзеяння: *паяльнік, ачышчальнік, рухавік, трайнік, грузавік* і інш.;

3) назвы прадметаў дзеяння: *апытальнік, чарнавік, патайнік, парнік, помнік, памятнік, халадзільнік* і пад.;

4) памяншальна-ласкальныя назвы: *пэндзлік, домік, ножык, носік* і г. д.

Суфікс -нік таксама ўтварае назвы

1) асоб: *работнік, аднакласнік, пяцёрачнік, намеснік, прапаведнік, будаўнік, садоў/нік*;

2) прадметаў быту: *падлюстэрнік, ашыйнік, падсвечнік, падрамнік, каласнік, падшыпнік, супнік, намордник, сметнік*;

3) памяшканняў: *цялятнік, парасятнік, кароўнік, свінар/нік, курат/нік*;

4) зараснікаў дрэў, раслін — зборных назоўнікаў: *папаратнік, ракітнік, асіннік, алешнік, бярэзнік*;

5) прылад дзеяння: *акучнік, напільнік* і іншыя назвы.

Нават у межах адной лексіка-семантычнай групы назоўнікаў можна вылучыць мнагазначны суфікс. Так, **суфікс -ец** утварае **назвы асоб** з розным значэннем:

1) асоб па роду дзейнасці: *купец, касец, жнец, тварэц*;

2) асоб па месцы нараджэння і жыхарства: *саратавец, уралец, каўказец, карэјэц, петрыковец*;

3) асоб па ўнутранай ці знешняй якасці: *умелец, удалец, хітрэц, мудрэц* і іншыя назвы.

Многія **прыстаўкі** таксама могуць быць мнагазначнымі. Параўнаем значэнні мнагазначнай прыстаўкі ***пера-*** **:**

Рэпозиторий ВГУ

1) ’зрабіць нанова, паўторна выканаць **базавае дзеянне’:** ***пера****араць*, ***пера****мераць*, ***пера****абуцца*, ***пера****фарбаваць*;

2) ’адольваць перашкоду’: ***пера****плысці*, ***пера****бегчы*, ***пера****йсці*, ***пера****скочыць*, ***пера****рваць*, ***пера****крычаць*;

3) ’перабольшыць меру’: ***пера****саліць*, ***пера****расці*, ***пера****поўніць* і іншыя значэнні.

Мнагазначныя прыстаўкі і ў прыкладах: ***пра****цягнуць*, ***пра****горкнуць* і ***пра****чытаць*; ***над****будаваць* і ***над****рэзаць*; ***пад****лезці*, ***пад****скочыць* і ***пад****ысці*; ***за****вярнуць* (за вугал дома) і ***за****бегчы* (на хвілінку); ***на****класці* і ***на****пісаць* і многія іншыя прыстаўкі.

3. <u>Аманімічныя</u> <u>марфемы</u> супадаюць па форме (гучанні), але не маюць нічога агульнага ў значэнні. Напрыклад: ***він****ны* і ***він****аваты*; ***мас****а* і ***мас****аж*; ***ран****ні* і *па****ран****іць*; ***сал****іць* і ***сал****іст*; ***куп****аціа* і ***куп****іць*; ***а****маральны* і ***а****пісаць*; ***пра****ўнук* і ***пра****амерыканскі*, ***пра****ехаць*; ***пра****зрысты* і ***пра****чытаць*; ***на****стольны* і ***на****двае*; ***на****пісаць* і ***на****крыж*; *серабр****ыст****ы* і *трактар****ыст***; *хлус****н****я* і *смеш****н****ы*, *саг****н****е*; *светл****ы*** і *мятл****а***, *ішл****а***; *вокн****ы*** і *смел****ы***, *чатыр****ы***, *бяр****ы***; *пол****е*** і *нясе* і г. д.

Адносіны аманіміі назіраюцца не толькі ў межах марфем пэўнага віду, але і ў марфем розных відаў, напрыклад: ***абрал а***; ***раз****ок* і ***раз****даць*; ***у****лезці*, *змолад****у*** і *наш* ***у*** .

4. <u>Антанімічныя</u> <u>марфемы</u> (іх няшмат), як і словы-антонімы, маюць супрацьлеглае значэнне: ***з****ганяць* (’рух к цэнтру’) **—** ***раз****ганяць* (’рух ад цэнтра ў розныя бакі’); ***узлезці***, ***ус****кінуць* (’рух уверх’) **—** ***з****лезці*, ***с****кінуць* (’рух уніз’); ***ува****йсці*, ***у****лезці*, ***у****пісаць*, ***ува****гнаць* (’унутр чаго-н.’) **—** ***вы****йсці*, ***вы****лезці*, ***вы****пісаць*, ***вы****гнаць* (’вонкі; вылучыць за межы чаго-н.’); ***на****верх* і ***з****верху* і інш.

℘ <u>ЗМЕНЫ Ў МАРФЕМНАЙ СТРУКТУРЫ СЛОЎ</u>

У працэсе развіцця мовы, на працягу доўгага ”жыцця слоў”, у іх структуры могуць адбывацца розныя змены: вытворная аснова можа ператварыцца ў невытворную, непадзельнае слова можа стаць члянімым, у словах могуць перамясціцца межы паміж марфемамі. Выявіць гэта дазваляе ***<u>этымалагічны аналіз</u>,*** які мае дачыненне да *дыяхранічнага словаўтварэння*, а не да *сінхранічнага.*

<u>Этымалогія</u> [грэч. *etymologia*, ад *etymon* – ’ісціна, сапраўднае значэнне слова’, + *logos* – ’вучэнне’] **—** гэта вучэнне пра паходжанне слоў і іх роднасныя адносіны да іншых слоў.

Тэрмін ***<u>сінхранія</u>*** [ад грэч. *syn* – ’разам, сумесна’, + *chronos* – ’час’] літаральна абазначае ’<u>адначасовасць</u>’, г. зн. стан мовы <u>ў адну эпоху</u>,

Рэпозиторий ВГУ

на пэўным этапе яе гістарычнага развіцця. Пры *сінхронным* (або *сінхранічным*) падыходзе на сучасным этапе развіцця мовы неабходна ўлічваць **жывыя словаўтваральныя сувязі** і адрозніваць факты **сучаснага стану** мовы ад фактаў яе **гісторыі.**

Тэрмін ***дыяхранія*** [ад грэч. *dia* – ’скрозь’, + *chronos* – ’час’] **—** г. зн. ’розначасовасць’, эвалюцыя мовы, змена стану мовы ў часе, гэта гістарычная паслядоўнасць развіцця асобных моўных з’яў і сістэмы мовы ў цэлым.

Такім чынам, сінхранічнае словаўтврэнне разглядае факты мовы ў іх узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці на пэўным адрэзку часу, а дыяхранічнае **—** на працягу ўсяго перыяду развіцця мовы. Аднак немагчыма падзяліць слова на марфемы на сучасным этапе, калі не ўлічваць гістарычныя змены ў іх. Таму **існуе цесная сувязь сінхранічнага і дыяхранічнага падыходаў,** сувязь этымалагічнага аналізу з марфемным і словаўтваральным. Гэта неабходна для таго, каб адмежаваць, не зблытаць факты жывой, сучаснай мовы з фактамі мінулага, гістарычнымі фактамі.

Як вышэй адзначалася, структура слоў у гістарычным плане і тыя змены, якія адбываліся ў іх на працягу развіцця мовы, раскрываюцца ў працэсе этымалагічнага аналізу.

У марфемным складзе слоў адбываюцца наступныя змены: ***апро́шчанне, перараскладанне, ускладненне, замяшчэнне, дэкарэляцыя, дыфузія.*** [**Заўвага:** У адрозненне ад першых пяці гістарычных змен у марфемнай структуры слоў, дыфузія **—** не толькі гістарычная змена, але і змена ў сучаснай мове]**.**

А П Р О́ Ш Ч А Н Н Е **—** гэта такая гістрычная змена ў марфемнай структуры слова, пры якой **вытворная аснова ператвараецца ў невытворную,** спрашчаецца (адсюль і назва з’явы **—** ад слова просты). Апрошчанне адбылося ў раней члянімых, а сёння невытворных словах: *беларус* (гіст. падзел: *бел-а-рус*), *сусед* (гіст. *су-сед*), *пір* (гіст. *пі-р*), *сірата* (гіст. *сір-ат-а*), *пасека* (гіст. *па-сек-а*), *перамога* (гіст. *пера-мог-а*), *палка* (гіст. *пал-к-а*), *рубеж* (гіст. *руб-еж*), *спакуса* (гіст. *с-па-кус-а*), *стары* (гіст. *ста-р-ы*), *добры* (гіст. *доб-р-ы*), *умова* (гіст. *у-мов-а*), *чыгунка* (гіст. *чыгун-к-а*), *хлопец* (гіст. *хлоп-ец*), *трапкач* (гіст. *трап-к-ач*), *сшытак* (гіст. *с-шы-т-ак*), *падручнік* (гіст. *пад-руч-н-ік*) і многіх іншых.

Як бачна з прыкладаў, апрошчанне можа быць **на стыку** 1) прыстаўкі і кораня (*перамога*, *пасека*, *умова*, *прычына*, *пры□клад*, *паветра*); 2) кораня і суфікса (*дар*, *жыта*, *сталіца*, *рубеж* і большасць іншых слоў з апрошчаннем); 3) прыстаўкі, кораня і суфікса (*сшытак*, *сведка*,

Репозиторий ВГУ

падсобны, падручнік); 4) двух каранёў у складаным слове (*беларус*, *шалапут*, *цемрашал*).

Ступень апрошчання можа быць рознай**:**

1. Поўнае апрошчанне. *Арол* (гіст. *ар-ол*). Тут суфікс *-ол-* меў тое ж значэнне, што і *-ёл-* у сучаснай мове ў слове *казёл*. Параўнаем таксама з назвай гэтай жа птушкі ў нямецкай мове: *Aar* , а таксама з грэчаскім *ornis* **—** ’птушка’.

Поўнае апрошчанне адбылося таксама ў словах: *пясец* (гіст. *пёс-ец*), *рубель* (гіст. *руб-ель*), *вобад* (гіст. *воб-вад*) *тхор* (з *дъх-ор-ь*, да якога аднакаранёвымі былі словы: *дух, дыхаць, дохлы*, а таксама *натхненне*).

2. Няпоўнае апрошчанне. У прыметніку *зычн-ы*, які можна параўнаць з назоўнікам *зык* у значэнні ’рэзкі, звонкі гук’, у БРС – 62 ён падаецца са стылістычнай паметай *разм.*; сустракаецца слова *зыкі* ў творах класікаў беларускай літаратуры **—** Я.Купалы, Я.Коласа, Ц.Гартнага; пазней яно архаізавалася.

Суткі (з мн. л. ад *съ-тък-ъ* са значэннем ’сутыкненне’, які ўтварыўся ад *сътъкнѫ тисѧ* ; т. ч., *суткі* **—** літаральна ’сутыкненне, зліццё дня і ночы’). Параўн. з *ткнуць*, *тыкаць*, *стык.*

Радыска. У рускай мове ёсць назоўнік *редис*, з якім міжвольна супастаўляецца беларускае *радыска*.

Парашок (гіст. *параш-ок*, вытворнае ад *порохъ*, з якім і асацыіруецца); *акруга* (гіст. *а-круг-а*), *выгада* (гіст. *вы-гад-а*) і інш.

Пры няпоўным апрошчанні некаторыя сляды ранейшай вытворнасці захоўваюцца, а пры поўным **—** зусім страціліся. Пры марфемным аналізе неабходна асаблівую ўвагу звяртаць на выпадкі няпоўнага апрошчання, каб не падмяніць марфемны аналіз этымалагічным. Трэба правільна вызначаць сучасныя семантычныя сувязі паміж словамі. Калі ж матывуемыя раней словы ўжо разышліся ў сваіх значэннях, змянілі семантыку, то і марфемны склад слова таксама зменіцца.

Прычыны апрошчання:

1. Самая асноўная прычына большасці выпадкаў апрошчання **—** гэта **змена значэнняў слоў,** якія раней матываваліся, разыходжанне ў значэннях слоў, звязаных раней семантычнымі і словаўтваральнымі сувязямі. Напрыклад, *вісок* (гіст. *віс-ок*) матывавалася дзеясловам *вісець* і абазначала ’вісячую пасму валасоў’; сёння страцілася сувязь паміж *вісець* і *вісок*, таму і марфемная будова назоўніка спрасцілася.

2. Другая прычына апрошчання **знікненне з актыўнага слоўніка (або наогул з мовы) суадносных слоў,** якімі раней дадзеныя словы матываваліся. Напрыклад: знікла з ужытку, архаізавалася слова *перст*,

Репозиторий ВГУ

і таму назоўнік *персцень* сёння лічыцца невытворным. Як невытворны разглядаецца і назоўнік *імгла*, бо знік са слоўніка раней суадносны з ім назоўнік *мга*. Параўнанне гэтых двух слоў раней давала падставу ў слове *імгла* выдзяляць суфікс *-л-* .

3. Трэцяя прычына апрошчання – **змены ў гукавым складзе слоў:**

дъх ор ъ → … тхор, дъщ ан ъ → … чан, натъщ е → … нашча,

** sър n ъ → сън ъ → сон* (параўн.: *спати*).

Дзякуючы апрошчанню, мова ўзбагачаецца новымі каранёвымі марфемамі, якія, у сваю чаргу, становяцца базай для ўтварэння новых вытворных слоў.

П Е Р А Р А С К Л А Д А Н Н Е — гэта такая гістарычная змена ў марфемнай структуры слова, у выніку якой адбываецца **перамяшчэнне межаў марфем** у складзе вытворнай асновы. Аснова ў сучаснай мове дзеліцца на марфемы інакш, чым раней: адзін афікс мог ператварыцца ў спалучэнне дзвюх марфем або дзве і больш марфем маглі зліцца на аснове апрошчання ў адну марфему. Пры гэтым слова захоўвае гукавы склад і па-ранейшаму застаецца вытворным. Напрыклад:

Гіст. падзел на марфемы	Падзел у сучаснай мове
бульб-оў-нік ; *сн-ед-а-нн-е* (старажытная прыстаўка *сън-*); *зн -я-ць* (< *сън -я-ти*); *ун - утр - ы* (< *вън - утр - и*, параўн.**:** *утр - об - а*); *па - рэч - к - а* (раней матывавалася словам *рэчка*)	*бульб-оўнік* ; *снеда-нне* ; *з-ня-ць*; *у - нутр - ы* (параўн.: *нутр - о*, *нутр- ан- ы*); *парэч - к - а* (параўн.: *парэч – нік*; сёння страцілася сувязь са словам *рэчка*)

Пры **апрошчанні** і **перараскладанні** часта разам са зменай структуры слова адбываецца і ***Д Э Э Т Ы М А Л А Г І З А Ц Ы Я*** (ад лац. прыстаўкі *de-* са значэннем ’страта, адмена, аддзяленне’ + грэч. *etymon* – ’ісціна, асноўнае значэнне слова’, + *logos* – ’вучэнне, паняцце, слова’) — гэта страта першапачатковага значэння і генетычнай сувязі з аднакаранёвымі словамі. Гэта з’ява, пры якой раней **матываванае слова становіцца нематываваным.** Дээтымалагізацыя адбылася ў прыведзеных намі вышэй прыкладах: *парэчка*, *тхор, чан*, *нашча*, *персцень*, *вісок*, *парашок*, *суткі*, *рубель*, *праўда*, *крыўда*, *пясец*, *дар*, *пір*, *сталіца*, *снедаць* і многіх іншых.

Репозиторий ВГУ

У С К Л А Д Н Е Н Н Е **—** такі від гістарычных змен у марфемнай структуры слоў, пры якім раней **невытворная аснова становіцца вытворнай, члянімай на марфемы.** Адна (каранёвая) марфема пачынае дзяліцца на корань і афікс. Гэта **працэс, супрацьлеглы апрошчанню,** таму і называецца ён ускладненнем, бо ўкладняецца марфемная будова слова. Ускладненне бывае звычайна ў іншамоўных словах. Калі з якой-небудзь мовы запазычваецца слова, то яго аснова не членіцца на марфемы, бо няма яшчэ ў мове аднакаранёвых з ім слоў. З цягам часу на базе гэтага іншамоўнага слова ствараюцца новыя, вытворныя ад яго роднасныя словы. Супастаўленне іх структуры і дае ўжо магчымасць у першапачатковым запазычаным слове вылучаць афікс, які раней не вылучаўся. Напрыклад:

Запазычанае з грэчаскай мовы слова ***анархія*** мела невытворную аснову *анархіj-* і канчатак *-а*, але ў сувязі з тым, што пазней ад яго ўтварыліся *анарх-іст*, *анарх-іс[т-с]к-і*, *анарх-ізм*, *анарх-ічн-ы*, аснова назоўніка *анарх-іj- а* стала члянімай на марфемы і вытворнай.

Таксама аснова слова ***трагедыя*** (ад грэч. *tragōidia*) напачатку пры запазычанні была невытворнай. Пазней узніклі вытворныя ад яго аднакаранёвыя *траг-ізм*, *траг-ік*, *траг-іч-н-ы*, *траг-іч-н-а*, *траг-іч-н-асць*, таму сёння аснова гэтага назоўніка ўскладнілася: *траг-едыj- а*.

Гэтак жа было напачатку невытворным слова ***эгаізм*** (фр. *égoïsme* < лац. *ego* – ’я’), а пазней утварыліся ад яго *эга-іст*, *эга-іст-ычн-ы*, *эга-іст-ычн-асць*, *эга-іст-ычн-а*, і аснова назоўніка *эга-ізм* стала вытворнай, матываванай.

Аналагічна асновы слоў ***мант-аж*** (з фр. *montage*), ***грав-юр-а*** (з фр. *gravure*), ***флат-ылij-а*** (з фр. *flottille*) сталі вытворнымі, членяцца на марфемы на базе параўнання іх са словамі пазнейшага ўтварэння**:** *манц-ірав-а-ць*, *манц-ёр*, *манц-іроў-к-а*, *манц-іроў-шчыц-а*; *грав-ёр*, *грав-ёр-н-ы*, *грав-ірав-а-ць*, *грав-іроў-к-а*; *флот.*

Д Э К А Р Э Л Я Ц Ы Я (ад лац. *de-* ’страта, адмена’ + лац. *correlatio* – ’суадносіны, узаемасувязь, узаемаабумоўленасць’) **—** літаральна: страта суадносін. Гэта такія змены ў марфемнай будове вытворнага слова, у выніку якіх знешняя структура слоў не змянілася (не змяніліся ні колькасць марфем, ні іх межы, ні іх гукавы склад), але **змяніліся характар або значэнне марфем і іх суадносіны** ў слове. Напр., назоўнік ***вай-н-а*** яшчэ ў агульнаславянскі перыяд утварыўся пры дапамозе суфікса *-н-* ад назоўніка *вои* (што значыць ’воін’). Сёння ён гэтак жа дзеліцца на марфемы, але матывуецца дзеясловам *вај-ав-аць*.

Рэпазиторий ВГУ

Слова ***за-мараз-к-і*** ўтварылася ад назоўніка *за́маразы* (’першыя марозы’), а сёння ўспрымаецца як дэрыват ад дзеяслова *за-мароз-і-ць*. Назоўнік ***лав-ец*** утварыўся ад назоўніка *ловъ* у значэнні ’паляванне’ (параўн. з устойлівым выразам, які захаваўся ў беларускай мове да нашых дзён: *пайсці ў ловы*); сёння слова *лавец* успрымаецца як вытворнае ад дзеяслова *лав-і-ць*. Слова ***люб-оў*** утварылася ад кароткага прыметніка *любъ* (’мілы, дарагі’), а сёння разглядаецца як вытворнае ад дзеяслова *люб-і-ць*.

Такім чынам, пры дэкарэляцыі часта **мяняецца значэнне ці функцыя афікса,** як, напрыклад, у слове *замаразкі* суфікс *-к-* быў напачатку **формаўтваральным** (памяншальна-ласкальным), а сёння з’яўляецца **словаўтваральным**, выражае значэнне пэўнага стану. У слове *вайна* корань быў **свабодны,** а стаў **звязаны.**

З А М Я Ш Ч Э Н Н Е **—** гэта **замена адной марфемы іншаю,** пры гэтым марфемны склад вытворнай асновы ў колькасных адносінах застаецца ранейшым. Напрыклад, у агульнаславянскай мове было слова ***зиница,*** утворанае ад гукапераймання *зинь*. Пад уплывам народнаэтымалагічнага збліжэння з *сін-і* корань *зін'-* **замяняецца на** *сін'-*.

Замяшчэнне назіраецца і ў выпадках **падраўноўвання асноў па аналогіі** пасля падзення рэдукаваных *ъ*, *ь* пад уплывам ускосных склонаў, дзе пераход рэдукаванага ў [э] (літара ***е***) быў законным, напрыклад, у словах: *Смаленск* замест *Смальнеск*, *Віцебск* замест *Віцьбеск*, *Пінск* замест *Пінеск*, *Глуск* замест *Глусек* і ў іншых тапонімах:

Н. *Смольньскъ, Витьбьскъ → Смол'неск, Вит'беск*

Р. *Смольньска, Витьбьска → Смолен'ска, Витебска* і г. д.

У рускай мове замяшчэнне адбылося ў слове *свидетель*, утвораным суфіксам *-тель* ад *съвѣдѣти* (< *вѣдѣти*) **—**’знаць, ведаць’, дзе корань *-вид-* замяніў старажытны корань *-вѣд-*: першапачатковае *съвѣдѣтель* змянілася на *свидетель* пад уплывам дзеяслова *видеть*. У беларускім слове *сведка* няма замяшчэння, тут захаваўся старажытны корань *-вед-*. Дарэчы, у беларускай мове ёсць і складаны назоўнік *відавочца* з першым коранем *від-*. Яшчэ прыклады замяшчэння: у рускай мове**:** *ладонь* са старажытнаславянскага *dolnь* (у беларускім *далонь* няма замяшчэння); руск. *тарелка* з *талѣрь* (< ням. *Teller*); у беларускім *талерка* не адбылося замяшчэння.

Репозиторий ВГУ

Д Ы Ф У З І Я (лац. *diffusio*)**,** ***або Ф У З І Я*** (ад фр. *fusion* < лац. *fusio* **—** ’зліццё’) **—** гэта **зліццё, узаемапранікненне марфем** пры захаванні імі ў той жа час выразнай самастойнасці. Гэту з’яву па-іншаму яшчэ называюць тэрмінамі ***ІНТЭРФЕРЭНЦЫЯ МОРФАЎ*****;** ***НАКЛАДАННЕ МОРФАЎ (МАРФЕМ)*****;** ***АПЛІКАЦЫЯ МОРФАЎ***. Адна з самых важных **прычын** дыфузіі **— сцяжэнне** аднолькавых галосных ці зычных. На пісьме дыфузія не заўсёды адлюстроўваецца. Напрыклад, у словах *Пухавіцкі, Хойніцкі* яна адлюстроўваецца і на пісьме, а ў словах *Валгаградскі* (*Валгагра*[*ц*]*кі*)*, гарадскі* (*гара*[*ц*]*кі*) дыфузія на пісьме не абазначаецца.

Д ы ф у з і я н а з і р а е ц ц а:

1. На стыку прыстаўкі і кораня:

прымаць ← *пры* + *ім* + *а* + *ць*; *прышлы* ← *пры* + *іш* + *л* + *ы* ;
расада ← *рас* + *сад* + *а* ; ростань ← *рос* + *ста* + *нь*;
разява ← *раз* + *зяв* + *а*; *расол* ← *рас* + *сол* .

2. На стыку кораня і суфікса (ці на стыку 2-х суфіксаў):

а) гэта інфінітывы на *-чы*, у якіх яшчэ ў дапісьмовы перыяд у гуку [*ч*] аб’ядналіся
- [*к*] каранёвы і [*т*] інфінітыўны: *пячы* ← *пяк*+*чы* (< *пек*+*ти*); аналагічна *таўчы, сячы, валачы* і пад. (па сёння ў паўднёва-заходніх гаворках Палесся захаваліся гэтыя старажытныя формы інфінітываў: *тоўкці*□ □, *пекці*□, *цекці*□, *сéкці*, *волокці*□ і г. д.);
- [*т*] каранёвы і [*т*] інфінітыўны: *расці* ← *раст* + *ці* ;

б) адносныя прыметнікі з суфіксам *-ск-* і каранёвым
- *-ск-* або *-цк-*: *віцебскі* ← *віцебск*+*ск*+*і*; аналагічна: *мінскі, омскі, томскі, пінскі, смаленскі, слуцкі* і інш.;
- *-с-*: *рускі* ← *рус* + *ск* +*і*; гэтак жа *беларускі, чавускі* і інш.;
- *-к-*: *казацкі* ← *казак*+*ск*+*і*; гэтаксама *гарадоцкі, мастацкі,* а таксама дыфузія на мяжы двух суфіксаў: *разбойніцкі* ← *разбой* + *н* + *ік* + *ск*+*і*);
- *-ч-*: *мака́рыцкі* ← *мака́рыч*+ *ск*+*і* ; таксама *пухавіцкі, аза́рыцкі, па́рыцкі*;
- *-т-*: *брэсцкі* ← *брэст* + *ск* +*і*, *малары*□*цкі*;

в) дзеясловы з суфіксам *-ну-* на стыку з каранёвым *-н-*: *пнуць* ← *пн* + *ну* + *ць*, аналагічна *прыпнуць*, *размінуцца*, *прыхінуцца*;

г) якасныя прыметнікі з суфіксам непаўнаты якасці *-ават-* (*-яват-*) і каранёвым *-ав-* (*-яв-*): *лілаваты* ← *лілав* + *ават* + *ы* ; гэтак жа

Репозиторий ВГУ

карычняваты, *ружаваты* (параўн. з аднаструктурнымі прыметнікамі з тым жа суфіксам, але без дыфузіі: *белаваты*, *сіняваты*).

3. У складаных словах — гэта **спляценне частак у выніку накладання** двух аднолькавых **складоў.** Гэты від дыфузіі (у складаных словах) называюць яшчэ **гаплалогіяй.** Яна назіраецца, напрыклад, у словах *марфаналогія*, *мінералогія*, *дзікабраз*, *трагікамедыя*, у якіх пераплятаюцца выдзеленыя склады:
фаналогія марф ем → марфафаналогія → марфаналогія;
вобраз дзік а → дзікаабраз → дзікабраз; гэтаксама: *мінералалогія → мінералогія*. [1]

****

Репозиторий ВГУ

[1] Гл.: Русский язык. Энциклопедия / Гл. ред. Ф. П. Филин.— М., 1979, с.150; Розенталь Д.Э. и Теленкова М.А. Словарь-справочник лингвистических терминов. — Изд. 2-е.— М., 1976, с. 70, 517.

II ПАРАДАК І ЎЗОРЫ МАРФЕМНАГА РАЗБОРУ СЛОЎ

****

ПАРАДАК МАРФЕМНАГА РАЗБОРУ

1. Часціна мовы.
2. Слова зменнае ці нязменнае. Калі зменнае, то як змяняецца.
3. Канчатак (у тым ліку і нулявы). Граматычныя значэнні канчатка.
4. Аснова, тып асновы (вытворная ці невытворная); адзначыць, калі перарваная.
5. Афіксы (постфіксы, суфіксы, прыстаўкі, інтэрфіксы).
   Функцыя афіксаў (словаўтваральны ці формаўтваральны); указаць, якую канкрэтна граматычную форму ці слова ўтварае, сфармуляваць, дзе магчыма, значэнне афікса.
   Аднаструктурныя словы, г. зн. словы з тымі ж афіксамі і з аднолькавым значэннем у іх; абазначыць афіксы ў прыкладах.
6. Корань, тып кораня (свабодны ці звязаны); калі свабодны — праілюстраваць гэта на прыкладзе.
   Роднасныя словы (падабраць столькі прыкладаў, колькі неабходна для вызначэння межаў **усіх марфем** у слове); абазначыць у іх корань.
   Варыянты кораня (у дужках паказаць, у якіх словах яны вызначаны).
   Афіксоід (суфіксоід ці прэфіксоід); падабраць аднаструктурныя словы з такім жа афіксоідам.
7. Графічнае абазначэнне марфемнай будовы слова.

УЗОРЫ МАРФЕМНАГА РАЗБОРУ

1. *Незацікаўленыя (асобы)* — дзеепрыметнік.
2. Слова зменнае, змяняецца па родах, ліках і склонах: *незацікаўлен* ***ую***, *незацікаўлен* ***ага*** , *незацікаўлен* ***ых*** і г. д.
3. Канчатак ***-ыя*** ; граматычныя значэнні яго: указвае на мн. л., Н. скл.
4. Аснова *незацікаўлен-* — вытворная.
5. Суфікс ***-ен-*** — формаўтваральны, утварае асобую неспрагальную форму дзеяслова — **дзеепрыметнік залежнага стану пр. ч.** *зацікаўл****ен****ы*. Аднаструктурныя словы: *асветл****ен****ы*, *злепл****ен****ы*, *прынес****ен****ы*.

   Прыстаўка ***не-*** — словаўтваральная, служыць для ўтварэння новага слова ***не****зацікаўлены* са значэннем **'адмаўленне** таго, што абазначана ўтваральнай базай *зацікаўлены*.' Словы з гэтай прыстаўкай: ***не****вясёлы*, ***не****абгрунтаваны*, ***не****абдуманы*.

Репозиторий ВГУ

Прыстаўка ***за-*** **—** словаўтваральная, утварае дзеяслоў ***за**цікавіць* са значэннем **’ахапіць** аб’ект **дзеяннем**, абазначаным утваральнай базай *цікавіць*.**’** Словы з гэтай прыстаўкай: ***за**ваяваць*, ***за**браць*, ***за**вербаваць*.

6. Корань *-цікаўл′-* **—** свабодны: *цікав-іш*.

   Роднасныя словы: *цікавіць, зацікавіць, цікаўнасць*.

   Варыянты кораня: *цікав- (цікавы), цікав′- (цікавіць), цікаў- (цікаўны)*.

7. Графічны разбор : *незацікаўлен**ыя*** .

1. *Дакормліванне (дзіцяці)* **—** назоўнік.
2. Слова зменнае, змяняецца па склонах: *дакормліванн**я*** , *дакормліванн**ем*** і г. д.
3. Канчатак ***-е*** ; граматычныя значэнні яго: указвае на адз. л., н. р., Н. скл.
4. Аснова *дакормліванн′-* **—** вытворная.
5. Суфікс ***-нн-*** **—** словаўтваральны, утварае назоўнік *дакормліва**нне*** са значэннем **’апрадмечанае абстрактнае дзеянне’**. Словы з гэтым суфіксам: *захвальва**нне, дамешва**нне**, данізва**нне**, дакручва**нне*.

   Суфікс ***-іва-*** **—** словаўтваральны, утварае ад слова *дакарм**і**ць* дзеяслоў *дакормл**іва**ць* са значэннем **працягласці, неабмежаванасці дзеяння**. Словы з гэтым суфіксам: *выкупл**іва**ць, выкрэсл**іва**ць, расчэпл**іва**ць, даігр**ыва**ць*.

   Прыстаўка ***да-*** **—** словаўтваральная, утварае дзеяслоў ***да**карміць*, мае значэнне **’завяршэнне дзеяння, давядзенне яго да канца’**. Словы з гэтай прыстаўкай: ***да**пісаць*, ***да**чытаць*, ***да**мыць*, ***да**шыць*.

6. Корань *-кормл′-* **—** свабодны: *кармл-ю*.

   Роднасныя словы: *карміць, корм, выкормліваць*.

   Варыянты кораня: *кармл′- (кармленне), карм′- (карміць), корм′- (кормiш), корм- (корм), -карм- (выкармак)*.

7. Графічны разбор: *дакормліванн**е***.

1. *Электравымяральны (прыбор)* **—** прыметнік.

Репозиторий ВГУ

2. Слова зменнае, змяняецца па родах, ліках і склонах: *электравымяральн ая , электравымяральн ыя , электравымяральн ую* і г. д.
3. Канчатак *-ы* ; граматычныя значэнні яго: паказвае на м.р., адз. л., Н. скл.
4. Аснова *электравымяральн-* — вытворная.
5. Суфікс ***-н-*** — словаўтваральны, утварае ад базавай асновы дзеяслова *вымяраць* адносны прыметнік *вымяраль**н**ы* са значэннем **’які прызначаны для дзеяння**, абазначанага ўтваральнай базай; здольны ўтвараць дзеянне’. Словы з гэтым суфіксам: *вязаль**н**ы, паяль**н**ы, заціск**н**ы, выграб**н**ы, уборач**н**ы.*

   Інтэрфікс ***-ль-*** выконвае **словаўтваральную функцыю —** злучае словаўтваральны суфікс з утваральнай базай у простым слове *вымяра**ль**ны*. Аднаструктурныя словы: *дая**ль**ны, чыта**ль**ны, спа**ль**ны, часа**ль**ны.*

   Суфікс ***-а-*** — словаўтваральны (тэматычны галосны), адносіць слова да часціны мовы — дзеяслова, **паказчык марфалагічнага класа дзеясловаў;** акрамя таго, абазначае **працягласць дзеяння.** Словы з такім суфіксам: *забір**а**ць, аглуш**а**ць, заграб**а**ць.*

   Прыстаўка ***-вы-*** — словаўтваральная, ад слова *мераць* утварае дзеяслоў ***вы**мераць* са значэннем **усебаковасці, вычарпальнасці дзеяння,** абазначанага ўтваральнай базай. Аднаструктурныя словы: ***вы**месці, **вы**мыць, **вы**бяліць.*

   Інтэрфікс ***-а-*** выконвае **словаўтваральную функцыю злучэння** а**с**н**оў** у складаным слове. Словы з гэтым інтэрфіксам: *цест**а**мясільны, цепл**а**любівы, турб**а**воз, сад**а**водства.*
6. Корань *электр-* — звязаны.
   Родныя словы: *электрык, электрычны, электрыфікацыя.*
   Варыянтаў кораня няма.

   Корань *-мяр-* — свабодны: *мер-а.*
   Родныя словы: *мерка, вымяраць, памераць.*
   Варыянт кораня: *мер- (мера).*
7. Графічны разбор: *| электравымяральн ы*.

1. *Аб’ядноўваецца (з аднадумцамі)* — дзеяслоў.
2. Змяняецца па ладах, асобах, ліках, часах і інш.: *аб’ядноўвай уц а, аб’ядноўвай у ся, аб’ядноўвай□ся* і г. д.

Репозиторий ВГУ

3. Канчатак ⊦***е***-⁞; паказвае на 3-ю ас. адз. л., ц. ч.

4. Аснова *аб'ядноўваj-…-ццa* — вытворная, перарваная.

5. Постфікс ***-ццa*** (варыянт *-цa*) — словаўтваральны, утварае зваротны дзеяслоў *аб'ядноўваць**ца*** ад *аб'ядноўваць*. Словы з такім постфіксам: *абгароджвацца, абцерабіцца, абціраццa.*

   Суфікс ***-оўвaj-*** (варыянт ***-оўва-***) — словаўтваральны, ад слова *аб'яднаць* утварае дзеяслоў *аб'ядн**оўва**ць* са значэннем **працяглasці, неабмежаванасці дзеяння**. Словы з такім суфіксам: *параўн**оўвaj**э, разраўн**оўвaj**э, скарыст**оўвaj**э, перасядл**оўвaj**э.*

   Прыстаўка ***аб-*** — словаўтваральная, ад слова *яднаць* утварае дзеяслоў *аб'яднаць* са значэннем **'скіраваць дзеянне вакол** чаго-н.' Словы з гэтай прыстаўкай: ***аб**гарнуць, **аб**сесці, **аб**віць, **аб**мазаць, **аб**капаць.*

6. Корань *-ядн-* — звязаны.
   Роднасныя словы: *яднаць, аб'яднаць, аб'ядноўваць.*
   Варыянт кораня: *едн- (еднасць).*

7. Графічны разбор: *аб'ядноўвaj э ццa* .

****

Рэпозиторий ВГУ

III ЛІНГВАМЕТАДЫЧНЫ КАМЕНТАРЫЙ ДА МАРФЕМНАГА АНАЛІЗУ

****

Асноўная колькасць памылак і цяжкасці пры марфемным аналізе слоў выкліканы няведаннем марфаналагічных з'яў і іншых ніжэй пералічаных акалічнасцей.

1. З'ЯВА "СКРАДВАННЯ" ЁТА

Як вядома, ётавыя літары *і* , *е* , *ё* , *ю* , *я* а) у пачатку слоў, б) пасля галосных, в) пасля апострафа, г) пасля ***ь*** і д) пасля ***ў*** абазначаюць 2 гукі: [**j**] + адпаведны галосны [***і***], [***э***], [***о***], [***у***], [***а***]. На марфемным шве (на стыку марфем) абазначаемыя ётавай літарай гукі могуць **адносіцца да розных марфем: зычны** [**j**] — да папярэдняй марфемы, а галосны — да наступнай. У такім разе пры падзеле слова на марфемы неабходна абавязкова адлюстроўваць гукавое абазначэнне ётавых літар скарочанай транскрыпцыяй. Такія словы дзеляцца на марфемы ў тлумачальнай частцы. Напрыклад:

яго — *j ago* , *двое* — *дв oj э* , *салаўіны* — *салаў j ін ы* , *вераб'іны* — *верабј ін ы* , *военачальнік* — *вој эначальнік* □, *Падмаскоўе* — *Падмаскоў j э* , *гаючы* — *гајуч ы* , *гіпербалізацыя* — *гіпербалізацыј а* .

Неапраўданымі і таму **н я п р а в і л ь н ы м і** будуць запісы, дзе ў скарочанай транскрыпцыі абазначаюцца таксама і ётавыя, якія знаходзяцца **ў межах адной марфемы.** Напрыклад, наступныя запісы няправільныя:

*за **jэ**зд∅*□, *мадэль**jэр*** □, *здольн **аja*** .

Правільны падзел іх такі: *заезд∅* □, *мадэльер* □, *здольн ая*.

2. З'ЯВА НАКЛАДАННЯ МАРФЕМ (або ДЫФУЗІЯ, ІНТЭРФЕРЭНЦЫЯ МОРФАЎ, АПЛІКАЦЫЯ)

На марфемным шве (часцей за ўсё на стыку словаўтваральнай асновы з суфіксам) назіраецца марфаналагічнае ўзаемапранікненне (узаемапрыстасаванне) морфаў — сумяшчэнне канца аднаго і пачатку або цалкам другога морфа (гл. прыклады **дыфузіі** на с. 19). Накладанне марфем бывае поўным і частковым, або няпоўным.

Репозиторий ВГУ

Пры супадзенні **ўсяго афікса** з часткай вытворнай асновы (базы) адбываецца **поўнае накладанне марфем:**

мінск і, віцебск і, слуцк і.

Пры **частковым накладанні марфем** супадае **частка суфікса** (зрэдку **інтэрфікса** ці **прыстаўкі**) з канцом або пачаткам вытворнай асновы (базы):

мінулы, дынамаўск і, расада.

Пры графічным марфемным разборы слоў з інтэрферэнцыяй морфаў патрэбна растлумачыць дадатковым запісам, якія марфемы ці іх часткі накладаліся на марфемным шве, як гэта паказана ніжэй.

Тыповыя выпадкі накладання марфем назіраюцца пры сумяшчэнні з канцом словаўтваральнай базы

1) суфікса адносных прыметнікаў *-ск-*:

беларускі — беларус + ск+ і ; полацкі — полацк + ск + і ;

баранавіцкі — баранавіч+ ск+ і; эмігранцкі — э+ мігр+ ант+ ск+ і ;

мужыцкі — мужык + ск+ і ;

2) суфіксаў інфінітыва *-чы, -ці*:

цячы — цяк + чы ; адрасці — ад + раст + ці ; адрачыся — ад + рак + чы + ся ;

3) дзеяслоўнага суфікса *-ну-* са значэннем аднакратнасці ці працягласці дзеяння**:**

мінуць — мін + ну + ць; рынуцца — рын + ну + ц + ца; пнуцца — пн + ну + ц + ца ; захінуць — за + хін + ну + ць ;

4) субстантыўнага суфікса *-ств-* з адцягненым значэннем працэсу, зборнасці, абстрактнасці:

грабежніцтва — граб+ еж+ н + ік + ств+ а ; кіраўніцтва — кір+ аў + нік + ств+ а ; чараўніцтва — чар+ аў+ н + ік + ств+ а ; ткацтва — тк+ а+ ч + ств + а ; чалавецтва — чалавек + ств+ а ; студэнцтва — студэнт + ств+ а ; юнацтва — юн + ак + ств+ а ; язычніцтва — языч + нік + ств + а ; бяспамяцтва — бяс + памят + ств + а ;

5) зрэдку — суфіксаў, якія далучаюцца да асноў некаторых запазычаных назоўнікаў на галосны**:**

таксіст — таксі + іст □; рэгбіст — рэгбі + іст □; сапранавы — сапрана + ав + ы ;

Репозиторий ВГУ

6) у асобных прыметніках — суфіксаў непаўнаты якасці *-ават-(-яват-)*: *карычняваты — карычняв + ават + ы* ; *ружаваты — ружав + ават + ы* ; *лілаваты — лілав + ават+ ы* ; *бэжаваты — бэж + ав + ават + ы* ;

7) інтэрфіксаў у простых і зрэдку — у складаных словах**:** *дынамаўскі — дынама+ аў/ ск + і* ; *дынамавец — дынама+ ав/ ец* □; *сельпоўскі — сельпо+ оў/ ск + і* ; *сельповец — сельпо + ов/ ец* □; *марфаналогія — марф + а + фаналог + ij + а* ; *Белазерск — бел + а + азер + ск* □;

8) асобныя выпадкі сумяшчэння прыставак з утваральнай базай (сцяжэнне гукаў)**:** *расольнік — рас + соль + н+ ік* □; *расаднік — рас + сад + н + ік* □; *разявіць — раз + зяв + і + ць*; *разяўляць — раз + зяўл + я + ць.*

Заўвага. У словах *прошлы* (*про + іш + л + ы*), *прышлы* (*пры + іш + л + ы*), *вымаць* (*вы + нім + а+ ць*), *прымаць* (*пры + нім + а+ ць*) і падобных варыянтнасць каранёў з’яўляецца вынікам выпадзення гукаў, а не накладання (сцяжэння) галосных на стыку прыстаўкі і кораня.

3. З’ЯВА ВЫПАДЗЕННЯ ГУКАЎ

На працягу развіцця мовы ва многіх словах нярэдка адбываліся фанетычныя змяненні, адно з якіх — выпадзенне гукаў у марфемах (часцей за ўсё ў каранях); у аднакаранёвых словах гэтыя гукі захоўваюцца**:** *глянуць* (*гляд + ну + ць*) — *паглядзець, погляд* ∅ □; *гніласны* (*гні + л + аст + н + ы*) — *гніласць*□.

З’ява выпадзення гукаў ускладняе вылучэнне марфем, бо нярэдка апошнія непазнавальна відазмяняюцца, як, напрыклад, карані ў словах *вымаць, гнуцца, гінуць, існаванн е* і іншых. Але падбор аднакаранёвых слоў дапамагае выявіць адноўлены (рэканструяваны) выгляд відазмененай марфемы і дае падставы разглядаць яе як **варыянтную,** а не як асобную, новую марфему. Вызначэнне **варыянтаў кораня** якраз і праду-гледжваецца схемай поўнага марфемнага аналізу слоў.

Репозиторий ВГУ

Такім чынам, падставай для вылучэння адзначаных каранёў як варыянтных з'явілася параўнанне іх семантыкі ў радзе роднасных слоў, якая з'яўляецца агульнай**:**

а) г нуцца (*гіб + ну + ц + ца*), *згіб, загіб* ;

б) гі нуць (*гіб + ну + ць*), *гіблы, пагібель*;

в) існаванне (*іст + н + ав + а+ нн+ е*), *існы* (*іст + н + ы*), *істота, істотна*;

г) згарнуць (*з + гарт + ну + ць*), *гартаць, згортваць*;

д) праязны (*пра + язд + н + ы*), *ездзіць, язда, паездка*;

е) кінуць (*кід + ну + ць*), *кідаць, выкідваць*;

ё) глынуць (*глыт + ну + ць*), *глытаць, глыток*;

ж) апрануцца (*а + прат + ну + ц + ца*), *вопратка*;

з) вярнуць (*вярт + ну + ць*), *вяртаць, вяртлявы*;

і) вяліць (*вяд + л + і + ць*), *вялы* (*вяд + л + ы*), *завядаць*;

к) тануць (*тап + ну + ць*), *тапіцца, патоп*;

л) пэцнуць (*пэцк + ну + ць*), *пэцкаць* і г. д.

4. ВАРЫЯНТНАСЦЬ МАРФЕМ

Адна і тая ж марфема можа відазмяняцца ў гукавым плане, выступаць у выглядзе розных **морфаў**, або **варыянтаў марфемы.** Варыянтнасць марфем з'яўляецца вынікам розных моўных з'яў і законаў**:** падзення рэдукаваных і іх змянення, узнікнення чаргавання гукаў (гістарычных і пазіцыйных), усячэння марфем, нарашчэння марфем пры пэўных фанетычных умовах, перараскладання асноў і з'яўлення інтэрфіксаў і інш. Сярод разнастайных відаў варыянтных марфем найбольшую цяжкасць у студэнтаў і адпаведна значную колькасць памылак выклікаюць часцей за ўсё наступныя **тры віды варыянтнасці:**

1) Варыянтнасць марфем як **вынік гістарычнага чаргавання губных *б, п, м, в*** і зрэдку ***ф*** **са спалучэннем "губны + *л′* "**. Гэты ***л′*** называюць ***l - epentheticum (l - эпентэтыкум),*** г. зн. **устаўны.** *L - epentheticum* **нельга разглядаць як суфікс,** ён заўсёды адносіцца да той жа марфемы, што і папярэдні губны:

***люб**іць — **люблю**, **карм**іць — **кармлю**, **кармл**енне, вы**яв**іць — вы**яўлю**, вы**яўл**енне, **мова — маўл**енне, **лав**іць — **лаўлю**, вы**лоўл**іваць, **зямны—**

Репозиторий ВГУ

***зямля, аграб**іць — **аграбл**енне, **ляп**іць — **ляпл**ю, з**лепл**ены, **граф**іць — **графл**ю, **графл**енне, ашчас**лів** іць — ашчас**лі**ў**л**ю, ашчас**лі**ў**л** іваць.*

2) Варыянтнасць марфем, **пазбаўленых фармальнага (гукавога) падабенства, істотна відазмененых** у выніку чаргавання гукаў. Асабліва гэта адносіцца да **дзеяслоўных суфіксаў** (радзей да **каранёў**) у інфінітыве і іх варыянтаў у аснове цяперашняга (будучага) часу**:**

*гарт**ав**аць — гарт**уй**уць, кір**ав**аць — кір**уй**у, архаіз**ав**ацца — архаіз**уй**уцца, трал**яв**аць — трал**юй**, даз**ір**аваць — даз**ір**уй, асацыj**ір**аваць — асацыj**ір**уj**э**ш, фарш**ыр**аваць — фарш**ыр**уj**у**ць, тарыф**ікав**аць — тарыф**ікуй**, філасоф**ствав**аць — філасоф**ствуй**, **фарсір**аваць — **фарсір**уj**у**ць, **балацір**ава**ц**ца — **балацір**уj**у**цца, **татуір**аваць — **татуір**уj**э**ш.*

Гэтак жа губляюць фанематычную блізкасць і **назоўнікавыя суфіксы** з іх варыянтамі ў адносных прыметніках, утвораных ад гэтых назоўнікаў. Такая варыянтнасць выклікана **бегласцю галосных** на месцы былых рэдукаваных у слабай пазіцыі **і чаргаваннем зычных**. Напрыклад:

*убор**к**а — убор**ач**ны, перапрацоў**к**а — перапрацов**ач**ны, ацэн**к**а — ацэн**ач**ны.*

Між іншым, такая ж з’ява **ў варыянтах каранёў** аналізуецца студэнтамі, як правіла, беспамылкова: ***лодк-**а — **лодач-**ны, **шапк-**а — **шапач-**ны* і г. д.

3) Варыянтнасць каранёў і суфіксаў у інфінітыве і ў аснове цяперашняга (будучага) часу **ў выніку нарашчэння** ў аснове цяп. часу (буд. ч.) **інтэрвакальнага зычнага j** , які яшчэ з дапісьмовага перыяду ўжываўся паміж галоснымі суседніх марфем:

***в**іць — **уj** у, **п**ець — **пяj** у, **л**іць — **льj** у* і пад.

Такое нарашчэнне **j** у суфіксах называюць таксама інтэрфіксам, які ўжываецца пры словазмяненні і формаўтварэнні і ўключаецца ў склад папярэдняй марфемы **:** [1]

*атрымл**ів**аць — атрымл**ів**а**j**уць, выветр**ыв**аць — выветр**ыв**а**j**уць, звяз**в**аць — звяз**вай**, камян**е**ць — камян**ej**э, слуп**яне**ць — слуп**янej**уць, садзейн**ічаj**уць, сакрэтн**ічаj**э, гаспадарнічаць — гаспадарніч**аj**э, іграць — іграj**э**, ганяць — ганяj**у**ць, трапляць — трапляj**э**, чарцвець — чарцвej**э**, шыкаць — шыкаj**э**,*

[1] Гл.: *Немченко В. Н.* Современный русский язык…, с. 39 – 41; *Тихонов А. Н.* Словообразовательный словарь …, т. 1, с. 23.

Рэпазіторый ВГУ

ціўкаць — *ціўкаjуць* і інш.

Каб не памыляцца ў вызначэнні марфем і іх варыянтаў, неабходна запомніць названыя і іншыя віды чаргаванняў, апісаных у навуковай і вучэбнай літаратуры ў раздзелах ”Фанетыка”, ”Марфаналогія”.

5. ВЫЗНАЧЭННЕ НУЛЯВЫХ МАРФЕМ

У адпаведнасці з праграмай па сучаснай беларускай мове для філалагічных спецыяльнасцей студэнты павінны ўмець вызначаць у словах нулявыя марфемы. Пры выкананні кантрольных работ студэнты далёка не заўсёды абазначаюць у словах не толькі нулявыя суфіксы, інтэрфіксы, але нават і нулявыя канчаткі, асабліва ў формах дзеясловаў прошлага часу мужчынскага роду і ў формах 2-й асобы загаднага ладу. І пры графічным разборы, і пры поўным марфемным аналізе слоў усе нулявыя марфемы трэба абазначаць адпаведным знакам**:** **канчаткі** — традыцыйна знакам □**,** **суфіксы** і **інтэрфіксы** — знакам ∅ (нуль гука) і разам з ім адпаведным значком суфікса (Λ) або інтэрфікса (—); нулявы інтэрфікс, як і матэрыяльна выражаны , абазначаецца рыскай зверху над знакам ∅, напрыклад: *дв**ух**сот∅годдз∅ е* , *працiснуў* □ *ся* , *спёк ∅*□*ся* , *размаўляй* □*це***,** *смей* □*цеся* , *пяць* □ *сот* □ , *пяц**і**сот∅гадов ы* , *ампер∅метр* □**,** *блок∅- схем а* , *Камянец∅-Падольск і* .

У складаных словах і састаўных назвах **канчаткі ад інтэрфіксаў з лёгкасцю можна адрозніць шляхам змянення слоў** . Пры скланенні канчаткі змяняюцца, а інтэрфіксы застаюцца нязменнымі. Параўнаем, напрыклад, словы **а) з інтэрфіксамі і адной асновай і б) з двума канчаткамі і дзвюма асновамі:**

а) *шасц**і**сот∅гадов ы*	**б)** *шэсць* □ *сот* □
*шасц**і**сот∅гадов ага*	*шасц* ***і*** *сот* □
*шасц**і**сот∅гадов аму*	*шасц* ***і*** *ст ам*
*шасц**і**сот∅гадов ым* і г. д.	*шасц* ***і*** *ст амі* і г. д.
*Буд**а**-Кашалёв а*	*Растоў* □ - *на-Доне*
*Буд**а**-Кашалёв у*	*Растов* ***а*** - *на-Доне*
*Буд**а**-Кашалёв ам*	*Растов* ***у*** – *на-Доне*
*Буд**а**-Кашалёв е*	*Растов* ***ам*** - *на-Доне*
дызель∅матор □	*горад* □ - *гігант* □
дызель∅матор а	*горад* ***а*** - *гігант а*
дызель∅матор ам	*горад* ***ам*** - *гігант ам*
капітан∅лейтэнант □	*лётчык* □ - *інжынер* □
капітан∅лейтэнант а	*лётчык* ***а*** - *інжынер а*
капітан∅лейтэнант ам	*лётчык* ***ам*** - *інжынер ам*

Репозиторий ВГУ

Як бачна з прыкладаў, **н у л я в ы я к а н ч а т к і** выяўляюцца шляхам супастаўлення слова **з іншымі** яго **формамі,** у якіх канчаткі матэрыяльна (праз гукі) выражаны: *дуб□ — дуб-* ***ы*** *, пяць□ — пяц-* ***і*** *, кінь-* ***ма*** *— кін-* ***у*** і г. д.

Падставай для вылучэння **н у л я в ы х і н т э р ф і к с а ў і с у ф і к с а ў** з'яўляецца супастаўленне гэтых слоў **з аднаструктурнымі словамі,** у якіх названыя марфемы матэрыяльна выражаны. Параўнайма**:**

Давыд∅-Гарадок	і	*Петр**а**град*	*узбярэжж∅а*	і	*ўзмор**j** э*
Ноў∅гарад	і	*Нов**а**лукомль*	*вараннё*	і	*звяр**j** о*
вальт∅мéтр	і	*градус**а**-дзень*	*валосс∅е*	і	*пер**j** э*
пят∅ы	і	*сарак**ав**ы*	*зарэччэ*	і	*задуб**j** э*
двухсот∅ы	і	*тысяч**н**ы*	*бязвус∅ы*	і	*бяскроў**н**ы*
двукосс∅е	і	*двукроп**j**э*	*кум∅а*	і	*свякр**ух**а*
воўч∅ы	і	*лісі**н**ы*	*свацц∅я*	і	*браці**х**а* і пад.

Выявіць у словах нулявыя канчаткі параўнальна лёгка, чаго нельга сказаць пра вылучэнне нулявых суфіксаў. Студэнтам з цяжкасцю даецца "бачанне" іх. Тут **трэба памятаць наступнае:** ва ўтвораных словах **н у л я в ы я с у ф і к с ы п а я ў л я ю ц ц а** толькі тады, **калі ад базавага слова ва ўтворанае бярэцца аснова ці ўсечаная аснова,** а не цалкам усё слова. Пералічым асноўныя

ГРУПЫ СЛОЎ З НУЛЯВЫМІ СУФІКСАМІ:

1. Парадкавыя лічэбнікі , утвораныя ад колькасных:

шэсць □ → шост∅ы, восем □ → восьм∅ы, дзесяць □ → дзесят∅ы.

2. Значная група **адсубстантыўных якасных прыметнікаў** прыставачна-нульсуфіксальнага ўтварэння**:**

без крыл аў → бяскрыл∅ы, без рук □ → бязрук∅ і, без зуб оў → бяззуб∅ы.

3. Параўнальна невялікая група нульсуфіксальных **адносна-прыналежных прыметнікаў** і некаторыя **адносныя:**

чалавек □ → чалавеч∅ы, сабак а → сабач∅ы, хлопец □ → хлапеч∅ы, вораг □ → варож∅ы; золат а → залат∅ы.

4. Самая вялікая, найбольш прадуктыўная група нульсуфіксальных назоўнікаў **2-га склан. м. р.** са значэннем **абстрактнага дзеяння,** утвораных ад дзеясловаў:

хадз іць → ход ∅, лаз іць → лаз ∅, пераходз іць → пераход ∅, прыходз іць → прыход ∅, аб'яздж аць → аб'езд ∅, абган яць → абгон∅, прамах нуцца → промах∅, пералаз іць → пералаз ∅,

Репозиторий ВГУ

пераляц ець → пералёт ∅.

5. Прыставачна-нульсуфіксальныя ўтварэнні назоўнікаў **2-га склан. м. р.** са значэннем **апрадмечанага дзеяння** або са значэннем **асобы:**

плав аць → поплаў ∅, дај іць → удой ∅, малац іць → умалот ∅, не слух аць → неслух∅.

6. Назоўнікі **2-га склан. н. р.** са значэннем **зборнасці;** гэта адназоўнікавыя ўтварэнні **з падаўжэннем зычнага** ў корані**:**

колас □ → калосс∅е, сук □ → суччо∅а, галіна → галл∅ё, камень □ → каменн∅е.

Разнастайныя прыставачна-нульсуфіксальныя і нульсуфіксальныя ўтварэнні ад назоўнікаў і прыметнікаў **з прасторавым значэннем, са значэннем адцягненай якасці, стану:**

мяжа → узмежж∅а, лес □ → узлесс∅е, за ракой → зарэччо∅а, па Нёмане → Панямонн∅е, высокі → узвышш∅а, ціхі → заціш∅а, бязлюдны → бязлюддз∅е, прывольны → прыволл∅е, вясёлы → вяселл∅е.

7. Назоўнікі **1-га склан. ж. р.** са значэннем **абстрактнага ці апрадмечанага дзеяння,** утвораныя ад дзеясловаў**:**

хадзіць → хад∅а, ездзіць → яздо∅а, думаць → думо∅а, размаўляць → размово∅а, абараніць → абарон∅а, паважаць → паваго∅а, плаціць → платo∅а, узнагародз іць → узнагародо∅а, рассадз іць → расадо∅а.

8. Аобныя назоўнікі **агульнага роду** са значэннем **асобы:**

задзір аць → задзірo∅а, не пасядз ець → непаседо∅а.

9. Назоўнікі **3-га склан. ж. р.** са значэннем **абстрактнага ці апрадмечанага дзеяння,** утвораныя ад дзеясловаў**:**

рэзаць → рэзьо∅, мазаць → мазьо∅, праесці → проедзьо∅, прарэзаць → проразьо∅.

10. Адпрыметнікавыя прыставачна-нульсуфіксальныя ўтварэнні назоўнікаў **3-га склан**. са значэннем **апрадмечанай якасці:**

сін і → просіньо∅, зялёны → прозеленьо∅, жоўты → прожаўцьо∅.

11. Множналікавыя назоўнікі са значэннем **абстрактнага ці апрадмечанага дзеяння,** утвораныя ад дзеясловаў**:**

выбіраць → выбарo∅ы, перавыбіраць → перавыбарo∅ы, скакаць → скокo∅і, адкідаць → адкідo∅ы, усходз іць → усходo∅ы.

12. Шматлікая група назоўнікаў і прыметнікаў, утвораных **складана-нульсуфіксальным спосабам** (або асноваскладання з нулявой суфіксацыяй):

Рэпозиторий ВГУ

сам □ *сял іцца → сам**а**сёл∅*; *рэдк і лес* □ *→ рэдк**а**лесс∅е*; *светлыя валасы → светл**а**валос∅ы*; гэтаксама: *сам**а**кат∅ , кар**а**ед∅ , адн**а**люб∅, пуст**а**мел∅я*; *даўг**а**лецц∅е, розн**а**галосс∅е*; *чарн**а**-бров∅ы, бел**а**зуб∅ы, сельск**а**гаспадарч∅ы, адн**а**рук∅і, бас**а**ног∅і, чацвер**а**ног∅і* і г. д.

6. ВЫЗНАЧЭННЕ АСНОВЫ

Бадай ці не самая вялікая колькасць памылак назіраецца ў вызначэнні асновы ў словах. Прычынай частотнасці такіх памылак з'яўляецца, на нашу думку, **разнабой у азначэнні паняцця асновы** ў лінгвістычнай і метадычнай літаратуры, у вучэбных дапаможніках для студэнтаў і ў падручніках для школ.

У некаторых лінгвістычных слоўніках аснова слова вызначаецца як "частка слова, у якой утрымліваецца яго лексічнае значэнне і якая застаецца, калі адняць канчатак і формаўтваральны суфікс" [1] *{Падкрэслена мной.— М.Я. }*. Супярэчлівае азначэнне прапануецца аўтарамі падручніка рускай мовы для 5-га класа 12-гадовай школы з рускай мовай навучання Л.А.Мурынай і інш.: "Основа изменяемого слова — это часть слова без окончания". А далей: "В основу не входят и формообразовательные суффиксы: *чита ть, чита л и* ". [2] Услед за Л.А.Мурынай пазней і аўтары падручніка беларускай мовы для 5-га класа школ з рускай мовай навучання ўключылі гэткае ж неапраўданае наваўвядзенне: "У аснову не ўваходзяць суфіксы, якія ўтвараюць формы слова: *спява ць, накрыча ц ца , спява л і* ". [3]

У "Беларускай граматыцы", у падручніках беларускай мовы для 4-га кл. і для 10 – 11 кл. асновай называюць частку слова без канчатка,

---

[1] *Розенталь Д.Э., Теленкова М.А.* Словарь-справочник лингвистических терминов.— М., 1976, с. 256; гл. таксама : *Ахманова О.С.* Словарь лингвистических терминов. — М., 1966, с. 296 – 297.

[2] Русский язык: Культура устной и письменной речи: Учеб. для 5-го кл. 12-летней общеобразоват. шк. с рус. яз. обуч./ *Л.А.Мурина и др.*— Мн., 2002, с. 45.

[3] Беларуская мова: Падручнік для 5-га кл. агульнаадукац. шк. з рус. мовай навуч. / *Г.М. Малажай, Л.С. Васюковіч, З.М. Кавалевіч, С.Р. Рачэўскі.* — Мн., 2003, с. 43.

Рэпозиторий ВГУ

у якой заключаецца індывідуальнае лексічнае значэнне слова. Тут (што, канешне, апраўдана) **формаўтваральныя суфіксы ў аснову ўключаюцца:** *выправ і л і* .[1]

Справа ў тым, што ў практычнай рабоце мы заўсёды маем справу не з агульным (родавым) паняццем асновы, а з канкрэтнымі відавымі яе паняццямі: 1) аснова **словазменная**; 2) **словаўтваральная** аснова (або ўтваральная, матывуючая, базавая, або проста **база**); 3) **формаўтваральная** аснова. Таму прыведзеныя вышэй у слоўніках, у акадэмічнай граматыцы і ў школьных падручніках азначэнні асновы як родавага паняцця з'яўляюцца не зусім недакладнымі. Перш чым даваць азначэнне асновы, трэба ўсякі раз агаварыць, пра якую з трох яе разнавіднасцей будзе ісці гаворка. Бо ў аднаго і таго ж слова можна вылучыць і словазменную, і словаўтваральную, і формаўтваральную асновы, а яны, як вядома, не супадаюць.

Такім чынам, трэба адрозніваць і размяжоўваць наступныя

ТРЫ ВІДЫ АСНОЎ:

1. Словазменная аснова. Гэта частка слова без словазменнай марфемы — без канчатка,— у якой заключана індывідуальнае лексічнае значэнне слова. Яе выдзяляюць **пры марфемным аналізе слоў.** Словазменную аснову традыцыйна, як і ў школьнай праграме па мове, называюць скарочана адным словам **— а с н о в а.** Напр.**:** *прайсці* **,** *прайшоў* □ **,** *пройд- уць***,** *прайшоўшы* **,** *пройдзен- ы.*

Пры аналізе марфемнай структуры лагічна ўключаць у аснову формаўтваральныя суфіксы і прыстаўкі.

2. Словаўтваральная аснова , або **база.** Гэта частка вытворнага слова без словаўтваральнага сродку (без фарманта). Словаўтваральную базу вылучаюць **пры словаўтваральным аналізе слоў.** Напрыклад, у тым жа слове ***пра****йсці* словаўтваральная база **—** дзеяслоў ***ісці*** . Для назоўніка *павеў* базай з'яўляецца ўсечаная аснова дзеяслова *паве- яць* **—** ***паве-*** . Для прыметніка *даўг****а****шэрс****н****ы* словаўтваральнай базай з'яўляецца аснова прыметніка ***доўг-*** *і* і аснова назоўніка

[1] Гл.: Беларуская граматыка. У 2-х ч. Ч. 1.— Мн., 1985, с. 215; *Сцяцко П.У., Гуліцкі М.Ф., Антанюк Л.А.* Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў.— Мн., 1990, с. 26; *Красней В.П.* Беларуская мова: Падруч. для 4-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. мовай навуч. / В.П.Красней, Я.М.Лаўрэль.— Мн., 2001, с. 333, 359; Беларуская мова: Падруч. для 10 – 11-х кл. агульнаадукац. шк. з рус. мовай навуч. / *В.І. Несцяровіч, Л.С. Васюковіч, Г.А. Арцямёнак, Л.І. Злобін, Я.Н. Марозава.* — Мн., 1999, с. 54.

Репозиторий ВГУ

шэрсць □ . Для назоўніка *ЭГБ* словаўтваральная аснова **—** пачатковыя літары базавага словазлучэння ***Э****нцыклапедыя* ***г****історыі* ***Б****еларусі.*

3. Ф о р м а ў т в а р а л ь н а я а с н о в а. Гэта частка слова без канчатка і формаўтваральнага суфікса. Формаўтваральную аснову звычайна вылучаюць пры марфалагічным аналізе слоў. Так, **у кожнага дзеяслова ёсць дзве** (а ў некаторых і **тры**) **формаўтваральныя асновы:**

1) аснова інфінітыва, якая вызначаецца шляхам адкідання паказчыка інфінітыва **—** формаўтваральнага суфікса ***-ці, -чы, -ць.*** Напрыклад, у тым жа дзеяслове ***прайсці*** аснова інфінітыва **—** *прайс'-* .

2) аснова цяперашняга (або **будучага) часу,** якая вызначаецца шляхам адкідання паказчыка ц. ч. (буд. ч.) **—** канчатка ў форме **3-й ас. мн. л. ц. ч. (буд. ч.).** Аснова цяперашняга часу бывае толькі ў дзеясловаў незакончанага трывання, а аснова будучага простага часу **—** у дзеясловаў закончанага трывання. Напрыклад**:**
яны пройд- (*уць*) **—** аснова **буд. ч. :** *пройд-* ; *яны замалюj-* (*уц*) *-ца* **—** аснова **буд. ч.** перарваная**:** *замалюj-* … *-ца* ; *яны ўжывај-* (*уц*) *-ца* **—** аснова **цяп. ч.** перарваная **:** *ужывај-* … *-ца* .

3) аснова прошлага часу, якая вызначаецца шляхам адкідання паказчыка прошлага часу **— суфікса м. р.** адз. л. ***-ў*** разам з нулявым канчаткам: *ён прайшо-* (*ў* □) **—** аснова пр. ч. *прайшо-* ;
ён прынёс- (∅ □) **—** аснова пр. ч. *прынёс-* **.**
Аснова прошлага часу вызначаецца толькі ў тых дзеясловаў, у якіх яна не супадае з інфінітыўнай асновай.

Такім чынам, у адным і тым жа слове вылучаюцца розныя асновы. ”Афіксы, якія ўтвараюць словы толькі з новым граматычным значэннем, уваходзяць у аснову словазмянення *(касіл- і)*, але не ўключаюцца ў аснову формаўтварэння *(касі- л і)*.” [1]

.....

Асновы бываюць яшчэ **вытворныя і невытворныя.** Гэтыя паняцці ў літаратуры часта блытаюць з паняццямі **члянімая і не члянімая на марфемы. В ы т в о р н а я —** гэта аснова матываваная, якую можна растлумачыць праз аднакаранёвае слова. Напрыклад**:**
дубок □ **—** ’невялікі ***дуб*** ’ ; *папанасіць* **—** ’многакратна або працягла выконваць дзеянне ***насіць***’ ; *заплакаць* **—** ’пачаць ***плакаць***’ **;** *кудысьці* **—** ’невядома ***куды*** ’ **;** гэтаксама *НАН* , *ЦСУ* , *Мінюст* □ , *лясгас* □ і пад. (Заўважце**:** у апошніх 4-х словах **вытворныя** асновы **нечлянімыя**).

[1] Беларуская граматыка …, с. 216.

Репозиторий ВГУ

Н е в ы т в о р н а я — гэта нематываваная аснова, значэнне якой немагчыма растлумачыць праз аднакаранёвае слова. Напрыклад**:** *дуб* □ , *бел- ы*, *глыбок- і*, *далёк- і*, *гаварыць* і г. д. Як бачна з прыкладаў, **невытворныя** асновы могуць быць **і члянімыя на марфемы.**

Пры абазначэнні асноў студэнты дапускаюць часцей за ўсё **наступныя памылкі:**

1) **Не ўключаюць у аснову словаўтваральныя постфіксы.** І хаця ў некаторых вучэбных дапаможніках і школьных падручніках па мове сустракаецца такі падыход, усё ж лагічным, дастаткова абгрунтаваным і апраўданым варта лічыць іншы пункт погляду, а іменна: ”Пры аналізе зваротных дзеясловаў **у склад асновы неабходна ўключаць і постфікс,** […] паколькі ён уплывае на семантыку слова ў цэлым і нярэдка з’яўляецца яго неад’емнай часткай (параўн.**:** *смяяц**ца** — смяю**ся**, смяеш**ся**, смяе**цца***).” [1]

2) **Разрываюць аснову на месцы інтэрфіксаў** у складаных словах, забываючы, што **ў словазменную аснову не ўключаюцца толькі канчаткі,** а не інтэрфіксы. У складаных словах, за выключэннем складаных лічэбнікаў, адзін канчатак (у зменных словах) і адна аснова**:**

светла-чырвон ы , *добразычліва* , *двоj э ўладдз∅ е* .

3) Наадварот, **не разрываюць аснову на месцы нулявога канчатка** ў зваротных дзеясловах, пры гэтым, як правіла, нулявы канчатак не заўважаюць, не абазначаюць значком □ , чамусьці ўспрымаючы як тоесныя **зусім розныя паняцці:** ”канчатак нулявы” і ”канчатка няма”.

Канчатка не бывае толькі ў нязменных слоў ці ў нязменных формаў слоў (інфінітыва, дзеепрыслоўя). **Запомніць:** у зменных словах **з постфіксамі** бывае **аснова п е р а р в а н а я толькі на месцы канчатка, у тым ліку і нулявога (**які знаходзіцца ўнутры слова). Постфіксы ўключаюцца ў словазменную аснову слова і захоўваюцца ва ўсіх яго формах**:**

вар’іраваўся — варj ірав а ў □ *ся* , *вар’іруючыся — варj ірујучыся* ;

к аго -небудзь , *куды-небудзь* ; *мыцца* , *мый* □ *цеся* , *мыj э цца* , *мыj уц ца* .

4) **Не заўважаюць другога канчатка** і адпаведна **дзвюх асноў** (а не адну) у складаных лічэбніках 200 – 900, 50 – 80 :

восем □ *сот* □ , *васьм і сот* □ , *пяць* □ *дзесят* □ , *пяцц ю дзесяцц ю*

[1] Скорнякова М.Ф. Морфемный и словообразовательный анализ. — М., 1981, с. 20.

Репозиторий ВГУ

7. ТЫПОВЫЯ НЕДАХОПЫ ПОЎНАГА МАРФЕМНАГА АНАЛІЗУ

Пры выкананні другога задання кантрольнай работы — поўнага марфемнага аналізу слоў — найбольш тыповымі памылкамі і недахопамі ў працах студэнтаў з'яўляюцца наступныя**:**

1) Няпоўны аналіз, прапускаюцца пэўныя этапы разбору:

а) не вызначаюцца функцыі марфем (не ўказваецца, словаўтваральны ці формаўтваральны афікс); не ілюструецца, якія канкрэтна формы ці словы ўтвараюцца тым ці іншым афіксам;

б) да афіксаў не падбіраюцца аднаструктурныя марфемы;

в) прыводзяцца далёка не ўсе варыянты каранёў, пры гэтым часта запісы афармляюцца недакладна, не заўсёды паказваецца, у якіх канкрэтна словах вылучаны прыведзеныя варыянты каранёў.

2) Для мнагазначнага афікса **ў якасці аднаструктурных** часта прыводзяцца словы **з іншым значэннем** гэтай марфемы.

3) Тыповымі з'яўляюцца **алагічныя запісы** тыпу**:**

а) *вывучаў* □ *ся* — … ***канчатка няма,*** (?!!) *аснова перарваная, вытворная*;

б) … *назоўнік*, ***зменная часціна мовы***… [У межах адной часціны мовы назоўнікі бываюць і зменныя, і нязменныя; змяняецца не часціна мовы, а словы] ;

в) … *прыметнік*, *слова зменнае, змяняецца* ***па ліку, родзе, склоне;*** *…дзеяслоў, слова зменнае, змяняецца* ***па асобе і ліку;*** [Як гэта — змяняецца па адной асобе? па адным ліку? па адным склоне ???]

г) *…інфінітыў, нязменная форма дзеяслова,* ***канчатак нулявы***… [У нязменных формаў і ў нязменных слоў **няма канчаткаў !!!**]

Каб папярэдзіць названыя і іншыя памылкі, трэба строга прытрымлівацца патрабаванняў да марфемнага аналізу, змешчаных вышэй у " ПАРАДКУ І ЎЗОРАХ МАРФЕМНАГА РАЗБОРУ СЛОЎ."

****

Рэпазиторий ВГУ

IV ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ

****

У ”Тэставых заданнях” змешчаны па 4 варыянты кантрольных тэстаў і адзін трэніровачны варыянт пад № 5 з адказамі на яго пасля кожнага задання. Гэта дазваляе выкарыстоўваць тэсты не толькі ў якасці кантрольнай работы, але і ў якасці навучальнай працы — для самападрыхтоўкі.

Заданне № 1. Выпішыце нумары слоў, у якіх выдзеленыя спалучэнні літар **адносяцца да ўказаных марфем ці ўваходзяць у іх склад.**

Варыянт 1: да кораня:

1) трамв***ай*****;** 2) звыч***ай*****;** 3) з’язджа***й*****;** 4) гор***ай*****;** 5) датл***а*****;** 6) позн***а*****;** 7) позв***а***

Варыянт 2: да суфікса:

1) дзесь***ці*****;** 2) пеналь***ці;*** 3) сес***ці*****;** 4) к мас***ці*****;** 5) травес***ці*****;** 6) рухавас***ц***і**;** 7) дзевятнацца***ц***і

Варыянт 3: да канчатка:

1) уд***ой*****;** 2) сям’***ёй*****;** 3) таб***ой*****;** 4) м***ой*****;** 5) так***ой*****;** 6) вадап***ой*****;** **7)** ст***ой***

Варыянт 4: да постфікса:

1) несяц***е*****;** 2) дзвес***це*****;** 3) узнясі***це*****;** 4) кудысь***ці*****;** 5) прыйс***ці*****;** 6) страс***ці*****;** **7)** асар***ці***

Варыянт 5: да прыстаўкі:

1) ***на***глядчыца; 2) ***на***рыс; 3) ***на***хіляцца; 4) ***на***мёк; 5) ***на***парстак; 6) ***на***равісты; 7) ***на***ракаць

Адказ на 5-ы варыянт : 1; 3

Заданне № 2. Выпішыце нумары слоў, у якіх **ёсць указаныя марфемы.**

Варыянт 1

а) $\overline{не}$: 1) небарака; 2) неаслабна; 3) невад; 4) недабор; 5) недабачваць; 6) нераст; 7) нечысць; 8) нечы; 9) неяк

б) □ : 1) Гусь-Хрустальны; 2) БДУ; 3) ГУМ; 4) факсіміле; 5) засмуціўся; 6) трохсот; 7) Петрапаўлаўск-Камчацкі; 8) твой; 9) насустрач

Варыянт 2

а) $\overset{\frown}{-лів-}$: 1) удушлівы; 2) надакучліва; 3) разгублівацца; 4) скупліваць; 5) цярплівасць; 6) скрэсліваць; 7) сарамлівасць; 8) асаблівасць; 9) вылуплівацца

Репозиторий ВГУ

б) *-ць* : 1) колькасць; 2) адмежаваць; 3) вымаць; 4) свежасць; 5) вынікаць; 6) прамаўляць; 7) арыентаванасць; 8) спустошанасць

Варыянт 3

а) *-нн-* : 1) падоўжанне; 2) пісьменнасць; 3) прабачэнне; 4) прабіванне; 5) прасвятленне; 6) праразанне; 7) праслаўленне; 8) праходжанне; 9) параўнанне

б) *∅* : 1) праўнук; 2) засол; 3) прастуда; 4) папрок; 5) нарасхват; 6) замуж; 7) хутка; 8) міжаконне

Варыянт 4

а) *-льн-* : 1) саўдзельнік; 2) радыкальны; 3) самакіравальнасць; 4) вязальны; 5) будзільнік; 6) натуральна; 7) радзільня; 8) чытальны; 9) настольны

б) *вы-* 1) выпадак; 2) выява; 3) вышыня; 4) выхаванка; 5) выпадковы; 6) вышморгваць; 7) вымаць; 8) вынас

Варыянт 5

а) *-оўва-* : 1) выпампоўваць; 2) размяркоўваць; 3) выкоўваць; 4) накіроўвацца; 5) выкарыстоўваць; 6) раскарчоўваць; 7) аб'ядноўваць; 8) выслухоўваць; 9) заслугоўваць

б) *-енн-* (*-энн-*): 1) вылучэнне; 2) прымірэнне; 3) знясіленне; 4) ажыўленне; 5) знеслаўленне; 6) разуменне; 7) пераадоленне; 8) падаўжэнне

Адказ на 5-ы варыянт : *а)* 5; 7; 8; 9; *б)* 1; 2; 4; 5

Заданне № 3. Выпішыце нумар **пятага лішняга** з пункта погляду **тоеснасці каранёвых або афіксальных марфем.**

Варыянт 1

а) 1) плавіць; 2) плаўкасць; 3) плаваць; 4) выплаўляць; 5) плаўлены;
б) 1) крухмаленне; 2) пагадненне; 3) акасцяненне; 4) паглыбленне; 5) азнаямленне

Варыянт 2

а) 1) панадворак; 2) надвор'е; 3) дворнік; 4) надворны; 5) дваровы;
б) 1) забабоны; 2) за́вязь; 3) загуменне; 4) завя□ць; 5) за́балаць

Варыянт 3

а) 1) цэль; 2) нацэльваць; 3) прыцэл; 4) прыцэльны; 5) цэльны;
б) 1) клятва; 2) малітва; 3) братва; 4) жратва; 5) бітва

Варыянт 4

а) 1) вартасць; 2) вартаваць; 3) вартаўнік; 4) вартаванне; 5) вартавы□;
б) 1) стражнік; 2) работнік; 3) дзесятнік; 4) зайздроснік; 5) саветнік

Репозиторий ВГУ

Варыянт 5

а) 1) жывёла; 2) жыхар; 3) жывы; 4) жывучы; 5) жыццё;
б) 1) прадстаўнік; 2) аднакласнік; 3) вынаходнік; 4) выпускнік; 5) вартаўнік

Адказ на 5-ы варыянт: *а)* 1; *б)* 4

Заданне № 4. Выпішыце нумар **чацвёртага лішняга** з пункта погляду **наяўнасці або адсутнасці суфікса.**

Варыянт 1

а) 1) шафёр; 2) сапёр; 3) акцёр; 4) візіцёр;
б) 1) веліч; 2) княжыч; 3) крывіч; 4) родзіч

Варыянт 2

а) 1) пагібель; 2) штабель; 3) рубель; 4) журавель;
б) 1) жаваранак; 2) пятак; 3) казляк (грыб); 4) маяк

Варыянт 3

а) 1) грыбніца; 2) завочніца; 3) капліца; 4) надомніца;
б) 1) аўчына; 2) руіна; 3) гільяціна; 4) вакцына

Варыянт 4

а) 1) чацвяртак; 2) мастак; 3) чужак; 4) важак;
б) 1) маладзік; 2) чаравік; 3) жулік; 4) гісторык

Варыянт 5

а) 1) ярлык; 2) электрык; 3) яблык; 4) упрытык;
б) 1) рэжысёр; 2) палацёр; 3) касцёр; 4) манцёр

Адказ на 5-ы варыянт: *а)* 1; *б)* 3

Заданне № 5. Выпішыце нумар **чацвёртага лішняга** з пункта погляду **тоеснасці значэння суфікса.**

Варыянт 1

а) 1) цырульнік; 2) прадпрымальнік; 3) мантажнік; 4) штогоднік;
б) 1) бараніна; 2) халадзіна; 3) свініна; 4) цяляціна

Варыянт 2

а) 1) паяльнік; 2) ручнік; 3) шасціграннік; 4) адстаўнік;
б) 1) лучыніна; 2) бярэзіна; 3) алешына; 4) аўчына

Варыянт 3

а) 1) намордник; 2) падлакотнік; 3) задачнік; 4) бярэзнік;
б) 1) глыбіня; 2) вышыня; 3) я□міна; 4) таўшчыня

Варыянт 4

а) 1) вымяральнік; 2) прабойнік; 3) зайздроснік; 4) кіпяцільнік;
б) 1) вязальны; 2) спальня; 3) ігральны; 4) радзільны

Репозиторий ВГУ

Варыянт 5

а) 1) цялятнік; 2) настаўнік; 3) прапаведнік; 4) прад'яўнік;
б) 1) лушпіна; 2) хваіна; 3) сунічына; 4) спружына

Адказ на 5-ы варыянт : *а)* 1; *б)* 4

Заданне № 6. Выпішыце **нумары** слоў **з адной прыстаўкай.**

Варыянт 1

1) напралом; 2) знявага; 3) напрамак; 4) заспакоіць; 5) застукаць; 6) запрыгоніць; 7) абняславіць; 8) запазычыць; 9) запатрабаваць

Варыянт 2

1) выскрэбваць; 2) зненавідзець; 3) напачатку; 4) занядбалы; 5) запакоўваць; 6) напрасаваць; 7) занавесіць; 8) занядужаць; 9) нарашчыняць

Варыянт 3

1) выправадзіць; 2) здагадвацца; 3) адазвацца; 4) задавольваць; 5) наперабой; 6) запраўляць; 7) напамінаць; 8) запазуха; 9) наперагонкі

Варыянт 4

1) наросхрыст; 2) запалавéць; 3) дапрасоўваць; 4) падвываць; 5) пазлучаць; 6) спадарожнік; 7) падзарабіць; 8) пазаядаць; 9) спасылка

Варыянт 5

1) знемагчыся; 2) знявечыць; 3) дапаможнік; 4) знаходжанне; 5) здабыча; 6) дапалуднаваць; 7) заварушы□ць; 8) напрапалу□ю; 9) западозрыць

Адказ на 5-ы варыянт : 3; 4; 5; 6; 8

Заданне № 7. Выпішыце **нумар шостага лішняга** з пункта погляду **тоеснасці значэння суфікса.**

Варыянт 1

1) бульбянішча; 2) гарохавішча; 3) жытнішча; 4) стогавішча; 5) халадзішча; 6) каноплішча

Варыянт 2

1) зубіла; 2) грузіла; 3) цёрла; 4) зубрыла; 5) пакрывала; 6) сядло

Заўвага **:** Усе 6 прыкладаў **—** назоўнікі.

Варыянт 3

1) латарэйны; 2) брудны; 3) лясны; 4) музейны; 5) прыродны; 6) хатні

Варыянт 4

1) сялянства; 2) какецтва; 3) падхалімства; 4) лакейства; 5) геройства; 6) дзівацтва

Репозиторий ВГУ

Варыянт 5

1) поціск; 2) намёк; 3) напамін; 4) даль; 5) роспыт; 6) стук

Адказ на 5-ы варыянт : 4

Заданне № 8. Выпішыце **нумары** слоў, **марфемны склад** якіх адпавядае ўказанай **схеме:**

Варыянт 1 ∩-- ∩ ∧ ∧ □	**Варыянт 2** ¬ ∩ ∧ ∧ ∧ □ ⌐	**Варыянт 3** ¬ ∩ ∧ ∧ □ ⌐
1) воўначасальны 2) нераўнамерны 3) прамавугольнік 4) нядобранадзейны 5) адзінаўладдзе 6) военачальнік	1) зачэпліваліся 2) напрактыкаваўся 3) наспіртоўваліся 4) збіраўся 5) прыбудоўвацца 6) пераадрасоўвайце	1) паўспорваліся 2) перабазіраваўся 3) дамалёўваліся 4) распілоўвайце 5) перайначваліся 6) прыкладайце

Варыянт 4 ¬ ∩--∩ ∧ □	**Варыянт 5** ¬ ∩ --¬ ∩ ∧ □
1) нераўнамерны 2) паветрадэсантны 3) нядобразычліва 4) па-сербахарвацку 5) неземляробчы 6) нябуйнагабарытны	1) немэтазгодны 2) атаясамліванне 3) незлапамятны 4) засухаўстойлівы 5) небаяздольнасць 6) асфальтаўкладчык

Адказ на 5-ы варыянт : 1; 4

Заданне № 7. Выпішыце ў левы слупок **пад нумарамі** ўрыўкі з марфемнага аналізу слоў, у якіх ёсць **памылкі ці недахопы** (недакладнасці) у афармленні запісаў. У правым запішыце **выпраўленыя варыянты.**

Варыянт 1

1) Своечасова — … Аснова свој э часов- — вытворная, перарваная.
2) Своечасовы — … Аснова свој- … -часов- — вытворная, перарваная.
3) Утварыў — дзеяслоў, слова зменнае, змяняецца па ладах, часах, родах, ліках… Канчатак нулявы…
4) Ашчаслівіць — дзеяслоў, слова зменнае, змяняецца па ладах, часах, асобах, ліках, родах. Канчатка няма.
5) ЧАЭС — назоўнік, нязменны; канчатка не мае. Аснова ЧАЭС — вытворная.

Репозиторий ВГУ

6) Трое — лічэбнік, слова зменнае, змяняецца па склонах… Аснова троj- — вытворная.

Варыянт 2

1) Водаправодны — … Аснова водаправодн- — вытворная.
2) Высокі — … Аснова высок'- — невытворная.
3) Ажыццяўляць — інфінітыў, нязменная форма дзеяслова; канчатка не мае.
4) Хада — назоўнік, слова зменнае, змяняецца па склонах: хад- у , хад- ой , хадз- е і г. д. Канчатак - а…
5) Чарада — назоўнік, зменная часціна мовы, змяняецца па ліках і склонах…
6) Дзвесце — … змяняецца па склонах: дв- ух- сот □, дв- ум- ст- ам , дв- ума- ст- амі … . Аснова дзв'-…-сц'- — вытворная, перарваная.

Варыянт 3

1) Шасцёрка — назоўнік, слова зменнае, змяняецца па ліку і склоне.
2) Здабываю — дзеяслоў, слова зменнае, змяняецца па ладах, часах, асобах, ліках…
3) Здзіўляцца — інфінітыў, нязменная форма дзеяслова; канчатка няма. Словазменная аснова здзіўляцца — вытворная.
4) Звяртацца — інфінітыў, нязменная форма дзеяслова. Канчатак нулявы. Словазменная аснова звярта-…-ца — вытворная, перарваная.
5) Зачыняймася — дзеяслоў, слова зменнае, змяняецца па ладах, асобах, ліках і інш.: зачыняj у ся, зачыняй□ся, хай зачыняj уц ца, і г. д. Канчатак -ма- …
6) Восемсот — лічэбнік, слова зменнае, змяняецца па ліках і склонах…

Варыянт 4

1) Шэсцьсот — … Аснова шэсць □ сот □ — вытворная, перарваная.
2) Шчасце — назоўнік, слова зменнае, змяняецца па склонах: шчасц- я , шчасц- ю , (у) шчасц- і .
3) Шчыльны — прыметнік, слова зменнае, змяняецца па родах, ліках і склонах…
4) Халасты — прыметнік, слова зменнае, змяняецца па ліках і склонах…
5) Грудзі — назоўнік, зменная часціна мовы, змяняецца па ліках і склонах…
6) Пяцьдзесят — … Дзве асновы: пяць- і -дзесят- — невытворныя.

Варыянт 5

1) Каменне — назоўнік, слова зменнае, змяняецца па ліках і склонах…

Рэпозиторий ВГУ

2) ВАК — назоўнік, слова зменнае, змяняецца па склонах: ВАК а , (у) ВАК у , ВАК ам і г. д. Канчатак нулявы. Граматычныя значэнні яго: указвае на м. р., адз. л. , Н. скл.

3) Добрасуседскі — … Аснова добрасуседск'- — вытворная.

4) РАУС — назоўнік, слова нязменнае; канчатка не мае.

5) Двоеўладдзе — … Аснова двоjэўладдз' -е — вытворная, перарваная.

6) Прыстасоўваўся — дзеяслоў, слова зменнае, змяняецца па ладах, часах, родах, ліках… Словазменная аснова прыстасоўваў- …-ся — вытворная, перарваная.

Адказ на 5-ы варыянт :

Няправільна	**Правільна**
1) *Каменне — назоўнік, слова зменнае, змяняецца па ліках і склонах…* 5) *Двоеўладдзе — … Аснова двоjэўладдз' -е — вытворная, перарваная.*	*Каменне — назоўнік, слова зменнае, змяняецца па склонах…* *Двоеўладдзе — … Аснова двоjэўладдз' -е — вытворная.*

Репозиторий ВГУ

V КАНТРОЛЬНАЯ РАБОТА

****

У кантрольную работу па марфеміцы ўваходзяць 2 заданні: 1) графічны разбор — падзел слоў на марфемы сімваламі (значкамі) і 2) поўны марфемны аналіз аднаго слова з задання № 1. Самастойнае выкананне ўсіх (ці хаця б шасці – васьмі) варыянтаў задання № 1 **з абавязковай праверкай** падзелу слоў **па "Марфемным слоўніку беларускай мовы"** А.М.Бардовіча і Л.М.Шакуна дасць магчымасць кожнаму студэнту ацаніць свой узровень практычных навыкаў па тэме і ступень сваёй падрыхтаванасці да заліка і экзамена.

ЗАДАННЕ № 1. Графічна (сімваламі) падзяліць словы на марфемы, абазначыць асновы.

ВАРЫЯНТ 1	**ВАРЫЯНТ 2**
1. Апублікаваннем	1. Гукапранікальнасць
2. Электраасвятляльны	2. Размаляваных
3. Вынаходніцтва	3. Буракаўборачны
4. Вымалёўваюцца	4. Вымуштраванасці
5. Асэнсаванасцю	5. Накіроўваецца
6. Раўнапраўе	6. Выратавацца
7. Высокапаважаны	7. Саманазіранне
8. Панабівацца	8. Захавальніца
9. Стагоддзем	9. Непамерна
10. Неразборліва	10. Насварыўся
11. Прасеяўся	11. Пяцідзесяцігоддзе
12. Закалыхванне	12. Перапраўлены
13. Дабраякаснасць	13. Параіцца
14. Выяўляецца	14. Закамянеласць
ВАРЫЯНТ 3	**ВАРЫЯНТ 4**
1. Вуглеабагачальнымі	1. Пяцідзесяцігоддзем
2. Белаэміграцкіх	2. Воданепранікальнымі
3. Падпілоўваецца	3. Безагаворачнасць
4. Заасфальтаваўся	4. Павысыпацца
5. Глебаўтварэнне	5. Выраўноўваўся
6. Прыдумвацца	6. Волевыяўленне
7. Выраўноўванне	7. Газазварачныя
8. Баязлівасць	8. Самаўпэўнены
9. Сямідзесяціпяцігоддзе	9. Сенаўборка
10. Вышэйпрыведзены	10. Напрошваюцца
11. Закахана	11. Напаўняючы
12. Аленегадоўля	12. Неабачліва
13. Чыйго-небудзь	13. Другагодніцтва
14. Кіраўніцтва	14. Чыім-небудзь

Репозиторий ВГУ

ВАРЫЯНТ 5	**ВАРЫЯНТ 6**
1. Асацыіравацца	1. Глебаўтваральных
2. Выкарчоўваннем	2. Вышывальшчыца
3. Нараджэнне	3. Ваеннаабарончыя
4. Сенанарыхтовачны	4. Самазаспакоены
5. Вуглеачышчальны	5. Безуважлівасць
6. Бесперапыннасць	6. Выпрабоўвацца
7. Нявыпраўлены	7. Відазмяненне
8. Натанцоўваліся	8. Падфарбоўваецца
9. Легкакрылы	9. Начытаўся
10. Непрадбачліва	10. Трохсотгоддзем
11. Напрылепліваць	11. Марудліва
12. Заахвочванне	12. Аздараўленне
13. Прымешваецца	13. Чыйму-небудзь
14. Пасадачны	14. Збіральніцтва
ВАРЫЯНТ 7	**ВАРЫЯНТ 8**
1. Абмяжоўваўся	1. Заслухоўванне
2. Вышэйсказаны	2. Газанепранікальны
3. Планаванню	3. Выратавальнік
4. Воданепранікальнасць	4. Насцярожанасць
5. Выпрацоўваецца	5. Атрымліваюцаа
6. Выгнуцца	6. Міжлесся
7. Падтрымаюцца	7. Ваеннаабавязаных
8. Засушванне	8. Панагравацца
9. Вуглепагружальны	9. Пераварыўся
10. Шасцісотгоддзе	10. Напружана
11. Дзівосна	11. Кровазліццём
12. Ажыўленнем	12. Мелкаводдзем
13. Нявольніцтва	13. Заклеіцца
14. Чыім-небудзь	14. Напрыдумляныя
ВАРЫЯНТ 9	**ВАРЫЯНТ 10**
1. Незласліва	1. Абапірацца
2. Сугучча	2. Прэміруюцца
3. Адступніцтва	3. Вогнеўстойлівасць
4. Ракетадром	4. Баязліўка
5. Цемнаскуры	5. Па-мастацку
6. Пазашчэпліваліся	6. Кінарэжысёр
7. Воданепранікальнасць	7. Недасягальна
8. Выстаўляюцца	8. Выкупліваўся
9. Падтрымліваецца	9. Шыракаплечы
10. Зняволеннем	10. Пераўзброіўшыся
11. Прадвызначаны	11. Закісанню
12. Па-грубіянску	12. Зводніцтвам

Репозиторий ВГУ

13. Выбудоўваўся	13. Гарачкапаніжальны
14. Палівальшчыца	14. Міжгор’е
ВАРЫЯНТ 11	**ВАРЫЯНТ 12**
1. Сумяшчальніцтва	1. Нераспрацаванасць
2. Патроіцца	2. Выкарыстоўваўся
3. Абмяжоўваецца	3. Разводдзе
4. Дамаўляюцца	4. Абазначыцца
5. Непакорлівасць	5. Адмаўляйцеся
6. Прылепліваючыся	6. Перагрупоўваюцца
7. Знясіленнем	7. Несвоечасова
8. Шматгалосы	8. Надломліваючыся
9. Непазнавальна	9. Выгнанніцтва
10. Паліклініка	10. Двухрадкоўе
11. Гарняцкіх	11. Бамбасховішча
12. Балансаванне	12. Белагруды
13. Бездаждж оўе	13. Прытоены
14. Саракадвухметровы	14. Танкадром
ВАРЫЯНТ 13	**ВАРЫЯНТ 14**
1. Вуглеачышчальны	1. Малаўжывальнасць
2. Падавальшчыца	2. Плакальшчыца
3. Размалёўвацца	3. Падтопліваюцца
4. Узнаўляльнасць	4. Зацікаўліваўся
5. Нядобразычліва	5. Медзеплавільных
6. Прычэпліваўся	6. Выздараўленне
7. Абломліваюцца	7. Перапрацоўвацца
8. Па-гаспадарску	8. Нязладжана
9. Перанасычаным	9. Нарастанне
10. Выдзіманне	10. Па-махлярску
11. Газазварачны	11. Павелічальнасць
12. Двоеўладдзе	12. Станкабудаўнічы
13. Прымацавацца	13. Сагнуцца
14. Міжброўе	14. Падклеіліся
ВАРЫЯНТ 15	**ВАРЫЯНТ 16**
1. Перахрышчаных	1. Запакаваны
2. Па-азіяцку	2. Па-еўрапейску
3. Вымуштраванасць	3. Запраганне
4. Падсаджванне	4. Паспешлівасць
5. Няўдзячна	5. Электравымяральны
6. Воўначасальны	6. Прыбіральшчыца
7. Парыльшчык	7. Заплямліваўся
8. Вылоўліваюцца	8. Заслепліваюцца
9. Прытупліваўся	9. Падтушоўвацца
10. Запаклёўвацца	10. Нясвоечасова

Репозиторий ВГУ

11. Па-сучаснаму	11. Новапабудаваны
12. Пастраенне	12. Нікеліраванне
13. Паўшар’е	13. Паабцярэбліваліся
14. Пераасэнсоўваліся	14. Пабаяцца

ЗАДАННЕ № 2. Зрабіць поўны марфемны разбор аднаго слова з задання № 1 (на выбар студэнта).



Репозиторий ВГУ

Л І Т А Р А Т У Р А

Беларуская граматыка. У 2-х ч. Ч.1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / Рэд. М.В.Бірыла, П.П.Шуба. — Мн., 1985, с. 214 – 353.

Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча.—Мн., 1994.

Винокур Г.О. Заметки по русскому словообразованию // Избранные работы по русскому языку. — М., 1959.

Земская Е.А. Современный русский язык: Словообразование.— М., 1973

Карский Е.Ф. Белорусы. Вып. 2. Исторический очерк словообразования и словоизменения в белорусском языке. — М., 1956.

Лопатин В.В. Русская словообразовательная морфемика: Проблемы и принципы описания. — М., 1977.

Марозава Я.Н. Марфалогія ў табліцах / Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў. — Віцебск, 1995.

Марозава Я.Н. Рыхтуемся да тэстаў па беларускай мове: Практычныя заданні, табліцы, схемы. — Віцебск, 2003.

Марозава Я.Н. Словаўтварэнне: Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў. — Віцебск, 1995.

Марозава Я.Н. Тэсты па беларускай мове: Вучэбны дапаможнік для студэнтаў. — Віцебск, 2002.

Моисеев А.И. Основные вопросы словообразования в современном русском литературном языке. — Л-д., 1987.

Немченко В.Н. Современный русский язык: Словообразование. — М., 1984.

Паўленка М.А. Нарысы па беларускаму словаўтварэнню.— Мн., 1978.

Плотнікаў Б.А., Антанюк Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум.— Мн., 2003.

Потиха З.А. Современное русское словообразование. — М., 1970.

Прыгодзіч М.Р. Словаскладанне ў беларускай мове. — Мн., 2000.

Скорнякова М.Ф. Морфемный и словообразовательный анализ (Учебно-справочное пособие) / Для студентов-заочников. — М., 1981.

Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія / Пад агульнай рэд. праф. М. С. Яўневіча. — Мн., 1997.

Сцяцко П.У. Беларускае народнае словаўтварэнне. Афіксальныя назоўнікі. — Мн., 1977.

Сцяцко П.У. Народная лексіка і словаўтварэнне. — Мн., 1972.

Улуханов И.С. Словообразовательная семантика в русском языке и принципы её описания. — М., 1977.

Шакун Л.М. Словаўтварэнне. — Мн., 1978.

Шанский Н.М. Очерки по русскому словообразованию. — М., 1968.

Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія.— Мн., 1987.

Репозиторий ВГУ

СЛОЎНІКІ

Ахманова О.С. Словарь лингвистических терминов. — М., 1966.

Бардовіч А. М., Круталевіч М. М., Лукашанец А. А. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы. — Мн., 2000.

Бардовіч А.М., Шакун Л.М. Марфемны слоўнік беларускай мовы.— 2-е выд.— Мн., 1989.

Булыка А. М. Слоўнік іншамоўных слоў / У 2-х т. — Мн., 1999.

Зализняк А. А. Грамматический словарь русского языка. — М., 1987.

Кузнецова А.И., Ефремова Т.Ф. Словарь морфем русского языка.— М., 1986.

Потиха З.А. Школьный словарь строения слов русского языка.— М., 1987.

Розенталь Д.Э., Теленкова М.А. Словарь-справочник лингвистических терминов. — 3-е изд. — М., 1985.

Русский язык. Энциклопедия / Гл. ред. Ф.П. Филин. — М., 1979.

Русско-белорусский словарь: В 3-х т. — 4-е изд. — Мн., 1993.

Словарь иностранных слов. — 18-е изд. — М., 1989.

Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне. / Пад рэд. М. В. Бірылы. — Мн., 1987.

Сцяцко П.У., Гуліцкі М.Ф., Антанюк Л.А. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў. — Мн., 1990.

Тихонов А.Н. Словообразовательный словарь русского языка: В 2-х т.— М., 1985.

Тихонов А.Н. Школьный словообразовательный словарь русского языка. — 2-е изд. — М., 1991.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т. — Мн., 1977 – 1984.

Шанский Н.М. и др. Краткий этимологический словарь русского языка.— 2-е изд. — М., 1971.

Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / Пад рэд. В.У.Мартынава.— Вып. 1 – 8. — Мн., 1978 – 1993.

Репозиторий ВГУ

З М Е С Т

I. **Марфемная структура слоў (тэарэтычныя пытанні)**…….. 3
1. Уводзіны……. 3
2. Паняцце марфемікі і марфемы…….. 5
3. Тыпы марфем…… 8
4. Змены ў марфемнай структуры слоў……... 13
II. **Парадак і ўзоры марфемнага разбору слоў**…… 21
III. **Лінгваметадычны каментарый да марфемнага аналізу**….. 25
1. З’ява ”скрадвання” ёта…….. 25
2. З’ява накладання марфем……... 25
3. З’ява выпадзення гукаў……... 27
4. Варыянтнасць марфем……. 28
5. Вызначэнне нулявых марфем……. 30
6. Вызначэнне асновы…….. 33
7. Тыповыя памылкі поўнага марфемнага аналізу……. 37
IV. **Тэставыя заданні**..……... 38
V. **Кантрольная работа**..……. 45
Літаратура..…… 49

Репозиторий ВГУ